КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 2 (1232) 9 студзеня 2016 г.

Тэндэнцыі

Што новага ў абласных музеях?

Набыць антыкварныя прадметы для стварэння пэўнай атмасферы ў музейнай экспазіцыі ці папаўнення фондаў з кожным годам становіцца ўсё больш цяжка: цэны "кусаюцца", а спонсарамі могуць пахваліцца хіба адзінкавыя ўстановы. "К" пацікавілася, што набылі абласныя музеі ў 2015 годзе і колькі сродкаў выдаткавалі на такія мэты. Зразумела, многае залежыць ад эканамічнай сітуацыі ў краіне, ад бюджэту канкрэтнай вобласці. Зараз жа музеі ў чаканні таго, колькі бюджэтных грошай вылучыць бюджэт у 2016 годзе на такія мэты і якой акажацца ў частцы выдаткаў Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" на 2016 — 2020 гады. Але звернемся да канкрэтыкі па годзе 2015-м.

Манеты 1941-га і бутэлечкі для парфумы

Мінскі абласны краязнаўчы музей у Маладзечне летась скарыстаў на закупку 192 мільёны 500 тысяч рублёў (у 2014-м сродкаў пайшло значна больш), з якіх 100 пайшло на набыццё твораў жывапісу — дзве карціны заслужанага дзеяча мастацтваў краіны Леаніда Дударэнкі і дзве — маладзечанскага майстра Уладзіміра Тамашэвіча. У фондах з'явіўся каляндар з саломкі, прысвечаны беларускім народным святам, аўтарства загадчыка аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Музычнага каледжа імя Міхала-Клеафаса Агінскага, члена Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Людмілы Валковіч-Борыс.

Летась у музеі з'явілася шкло канца XIX — пачатку XX стагоддзяў у стылі мадэрн, а таксама дзве камінныя вазы, бутэлечкі для парфумы, дробная пластыка пачатку 1950-х. Дзвюма манетамі 1941 года папоўнілася калекцыя нумізматыкі. Але гэта яшчэ не ўсё. Для экспазіцыі пачатку XX стагоддзя патрэбен, напрыклад, адпаведны часу канцылярскі стол. І калі знайсці яго не праблема, то набыць адшуканае — істотнае пытанне. Фінансы, фінансы… Сярод іншых планаў на 2016-ты — і рэстаўрацыя дакументаў.

Мінералы ў Брэсце

Брэсцкаму абласному краязнаўчаму музею з бюджэтных сродкаў кожны год выдзяляецца 25 мільёнаў на набыццё новых рэчаў. Што можна набыць на такую суму?

Заканчэнне чытайце **на старонках 6 — 7.**

С. 2

АДРАДЖЭННЕ ДУХОЎНАСЦІ

Адной з прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" сёлета ўзнагароджаны Нацыянальны мастацкі музей нашай краіны. Высока адзначана праца над шэрагам міжнародных праектаў, прысвечаных духоўным традыцыям. Адзін з этапаў на гэтым шляху — выстава беларускага іканапісу ў Венгрыі, кадры з якой аздабляюць гэту паласу.

Фота прадастаўлены музеем

Соцыум

Канец 2015 года для Дзіцячай музычна-мастацкай школы мастацтваў № 1 горада Мінска выдаўся святочным: установа адзначыла сваё 35-годдзе, атрымаўшы за плённую працу у тым ліку падзячны ліст Прэзідэнта краіны. Аднак у педагогаў і навучэнцаў не атрымліваецца цалкам радавацца прыемным падзеям, бо над будынкам школы які год вісіць пагроза зносу…

Настасся ПАНКРАТАВА

Пытанне вырашыць… пятля?

Планы генплана

Мінск актыўна забудоўваецца, і ўжо не пазнаць абрысы гораду нават дзесяцігадовай даўніны. Раён колішняй вёскі Міхалова не стаў выключэннем. Калі яшчэ летась навучэнцы музычнага аддзялення Дзіцячай музычна-мастацкай школы мастацтваў №1 ішлі на заняткі праз прыватны сектар, то апошнія месяцы тыя хаткі адна за адной знікаюць. Сёння на велічэзнай пустэчы па цотным баку вуліцы Алібегава будынак культурнай установы стаіць практычна ў адзіноце. Не дзіва, што заклапочаныя бацькі навучэнцаў штодня сустракаюць дырэктара ўстановы Жанну Куеўду адным і тым жа пытаннем: "Што з намі будзе?"

— У генплане горада будынак нашага музычнага аддзялення (юныя мастакі займаюцца ў двух філіялах, якія месцяцца па вуліцах Слабадская і Касманаўтаў) значыцца як той, што падлягае пад знос ужо гадоў восем, — тлумачыць сітуацыю Жанна Валер'еўна. — Аднак пытанне да гэтай пары не вырашана і нават не зразумела, якім чынам гэта будзе зроблена…

Побач распачынаецца ўзвядзенне жылых шматпавярховак 2-й і 3-й чаргі. Туды неабходна пракладаць камунікацыі, а будынак школы гэтаму замінае. Да таго ж, вуліцу Алібегава, што звязвае мікрараён Сухарава з праспектам Дзяржынскага, плануецца пашыраць, і невялічкая "музыкалка" трапляе ў "чырвоную" лінію перапланіроўкі…

Неверагодныя мары навабудаў

Зразумела, ніхто не зачыніць школу і не выставіць паўсотні дзяцей на вуліцу, але выкладчыкаў і бацькоў справядліва хвалююць варыянты вырашэння наспелай праблемы. Яшчэ год таму актыўна абмяркоўвалася магчымасць узвядзення новага будынка ДММШМ, які нарэшце аб'яднаў бы пад адным дахам юных музыкантаў і мастакоў. Непадалёк ад сучаснага адраса быў нават вылучаны зямельны ўчастак для такога будаўніцтва. Ідэальны варыянт!

— Мы ўжо шчыльна працавалі з "Белжылпраектам", знаходзіліся недзе на перадпраектнай стадыі. Аднак выйшлі ўдакладненні да санітарных норм і правіл для ўстаноў дадатковай адукацыі. Там дакладна прапісана, якімі мусяць быць памяшканні. У сувязі з новымі патрабаваннямі высветлілася, што на гэтым кавалаку зямлі мы ўжо банальна не змяшчаемся… — уздыхае дырэктар установы.

У прыватнасці, для навучання жывапісу неабходна мець у наяўнасці 5 квадратных метраў на дзіця. Калі ў сярэднім група складаецца з 9 — 12 чалавек, то толькі для навучэнцаў трэба прадаставіць клас у 60 квадратных метраў, не ўлічваючы настаўніка, а таксама прастору для шафаў, для захавання наглядных дапаможнікаў…

Заканчэнне — **на старонцы 4.**

Рэальная сфера

Стрыт-арт у дапамогу ЖКГ

2015 год быў адзначаны з'яўленнем на вуліцах Мінска вялікай колькасці легальных стрыт-арт праектаў. Акрамя таго, адбыліся маштабныя фестывалі з удзелам як айчынных, так і вядомых замежных майстроў у гэтай вобласці. Пра тое, чаму вулічнае мастацтва стала патрэбным беларусам, а таксама пра асаблівасці і тэндэнцыі яго руху ў Беларусі для "К" распавёў кіраўнік і заснавальнік арт-студыі "ТакТак" Алесь Благій (Kontra).

— Стрыт-арт адназначна самы новы і ўніверсальны від мастацтва для Беларусі. Яшчэ некалькі гадоў таму цяжка было ўявіць, што Мінгарвыканкам можа даць згоду на роспіс сцен жылых дамоў і дзяржаўных устаноў. Паступова прыходзіць разуменне, што стрыт-арт і графіці могуць не толькі шкодзіць, але і дапамагаць. Да прыкладу, вулічнае мастацтва можа выконваць ролю не такога ўжо і дарагога сродку аднавіць лакальную архітэктуру тых жа тыпавых спальных раёнаў, дзе чалавеку заўжды некамфортна знаходзіцца. Часцяком мастакі працуюць не за ганарар, а на валанцёрскіх умовах дзеля самарэалізацыі. Менавіта так мы можам удасканаліць прастору, дзе жывем.

Ад пачатку да развіцця

— Некалі штуршок у кірунку развіцця вулічнага манументальнага мастацтва ў Беларусі дала стрыт-арт-супольнасць "Signal", і сваім новым праектам "Urban Myths" працягвае рух гэтай з'явы ў прасторы нашай краіны. Работы, створаныя ў рамках гэтага праекта, упрыгожваюць не толькі мінскія вуліцы, але і брэсцкія, віцебскія, баранавіцкія, гомельскія, рагачоўскія і многіх іншых гарадоў. Апроч таго, другі год запар пры падтрымцы Пасольства Бразільскай Рэспублікі ў нашай краіне ладзіцца беларуска-бразільскі стрыт-арт-фестываль "Vulica Brasil". Фэсты такога кшталту ліквідавалі прагалы паміж уладамі і мастакамі, і гэта вельмі добра. Таксама дзякуючы такім акцыям, фестывалям і добраахвотніцкім ініцыятывам адносіны гараджан да стрыт-арту літаральна за тры гады змяніліся ў бок амаль толькі пазітыўнага стаўлення.

Галоўнае — талент і азарт

— Акрамя беларускіх фэстаў, я ўдзельнічаў у буйных імпрэзах вулічнага мастацтва ў Польшчы, Расіі і Украіне. Магу сказаць, што айчынныя праекты кшталту "MustAct", "Urban Myths" і "Vulica Brasil" не адрозніваюцца па ўзроўні і арганізацыі ад тых жа польскіх фэстаў, дзе фінансаванне, якасць матэрыялаў значна мацнейшыя, дзе нават можна атрымаць ганарар. Але справа не ў ганарарах, галоўнае тое, што таленавітых асоб у нас такі ж працэнт, як і ў любой іншай краіне: тое бачна па ўзроўні прац беларускіх мастакоў — кожны мае свой адметны стыль і выдатны пошук.

Сёлетнія праекты

— Што да мастакоў арт-студыі "ТакТак", то для нас стрыт-арт — гэта ўлюбёная справа, на якую мы аддаем ці не ўвесь свой вольны час. Век нашай каманды пакуль невялікі, але кожны з удзельнікаў мае значны досвед як у вулічным мастацтве, так і ў графічным дызайне, ілюстрацыі. Нашы працы зараз упрыгожваюць вуліцы горада, двары і дзіцячыя пляцоўкі.

Заканчэнне чытайце **на старонках 6 — 7.**

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Афіцыйна

Узнагароды — лепшым

Прэзідэнт Беларусі прысудзіў прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва 2015 года. Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, указы аб прысуджэнні названых прэмій Аляксандр Лукашэнка падпісаў 30 снежня мінулага года. Самі ўзнагароды ва ўрачыстай атмасферы плануецца ўручыць 12 студзеня ў сталіцы.

Усяго па выніках 2015 года былі прысуджаны 5 прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне". Імі адзначаны аўтарскія і працоўныя калектывы за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы.

Так, высокая ўзнагарода прысуджана аўтарскаму калектыву ў складзе пазаштатнага супрацоўніка галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання Беларускага радыё Алены Харашэвіч і прафесара кафедры крымінальна-выканаўчага права Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Анатоля Шаркова. Менавіта гэтымі людзьмі была зроблена вялікая праца па стварэнні кнігі-рэквіема "Жыць і помніць". У названым выданні абагульнены вынікі работы па вызначэнні і вывучэнні месц пахавання беларусаў — абаронцаў Айчыны ў розных кутках Еўропы.

Таксама прэміяй адзначаны калектыў Нацыянальнага мастацкага музея, які паспяхова рэалізаваў буйнамаштабныя выставачныя праекты, накіраваныя на ўмацаванне духоўных каштоўнасцей у сучасным грамадстве. Акрамя таго, удастоены ўзнагароды і калектыў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра "Маці і дзіця", які дасягнуў значных поспехаў у рэалізацыі мерапрыемстваў па захаванні жыцця і здароўя маці і дзяцей.

Сярод лаўрэатаў прэміі — епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веньямін, які ўнёс важкі ўклад у духоўнае адраджэнне Беларусі, асветніцкую і дабрачынную дзейнасць, а таксама настаяцель рэлігійнай абшчыны "Парафія Святой Тройцы" ў вёсцы Росіца Верхнядзвінскага раёна мясцовага рэлігійнага аб'яднання "Віцебская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі" Часлаў Курэчка. Ягоны важкі ўклад у захаванне міжканфесійнага міру і нацыянальнай згоды, а таксама актыўны ўдзел у духоўна-асветніцкай дзейнасці краіны і прапагандзе здаровага ладу жыцця заслужылі шырокае прызнанне ў грамадстве.

Па выніках 2015 года прысуджаны і 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Імі ўганараваны дзеячы культуры і мастацтва, навукі, педагогі, аўтарскія калектывы і ўстановы культуры краіны за значныя дасягненні ў галіне выяўленчага і тэатральнага мастацтва, аматарскай творчасці, музейнай справы і выхавання моладзі.

Так, прэмію атрымаў аўтарскі калектыў галоўнай дырэкцыі "Агенцтва тэлевізійных навін" Белтэлерадыёкампаніі ў складзе карэспандэнта спецыяльнага аддзела навін культуры Наталлі Бардзілоўскай, галоўнага рэжысёра Алега Даўгаполава і загадчыка аддзела навін культуры Міхаіла Равуцкага за стварэнне гісторыка-дакументальнага серыяла "Яны спявалі за Радзіму" і іншыя праекты, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне моладзі.

Аўтарскі калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета ў складзе галоўнага мастака Аляксандра Касцючэнкі і галоўнага рэжысёра Міхаіла Панджавідзэ ўганараваны прэміяй за значныя дасягненні ў развіцці сучаснага операнага мастацтва і пастаноўку спектакля "Царская нявеста". Акрамя таго, за значны ўклад у захаванне нацыянальных культурных традыцый і стварэнне візуальных вобразаў праваслаўных святынь з дапамогай галаграфічных тэхналогій высокай узнагароды ўдастоены аўтарскі калектыў у складзе галоўнага навуковага супрацоўніка лабараторыі нелінейнай оптыкі Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Паўла Апанасевіча, першага намесніка генеральнага дырэктара ТАА "Магія святла" Сяргея Гінака і старшыні савета дырэктараў ЗАТ "Галаграфічная індустрыя" Леаніда Таніна.

Лаўрэатам прэміі стаў выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Антон Бельскі. Таленавіты майстар выканаў роспіс у храме Іаана Прадцечы Свята-Узнясенскага жаночага манастыра ў гарадскім пасёлку Баркалабава Быхаўскага раёна.

За значны ўклад у захаванне нацыянальных культурных традыцый і стварэнне на высокім мастацкім узроўні спектакля "Пясняр", прысвечанага творчай дзейнасці Уладзіміра Мулявіна, прэмію атрымаў калектыў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага. Таксама ўганараваныя калектыў Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра, які дасягнуў высокіх творчых поспехаў і ўнёс важкі ўклад у развіццё і папулярызацыю тэатральнага мастацтва, ды калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Прэмія прысуджана за значны ўклад у развіццё музейнай справы і патрыятычнае выхаванне насельніцтва.

Высокай дзяржаўнай узнагародай цяпер будуць ганарыцца і ў Нясвіжскім раёне Мінскай вобласці: мясцовы ўзорны ансамбль "Аношкаўскія музыкі" Аношкаўскай дзіцячай школы мастацтваў атрымаў прэмію з фармулёўкай "за мэтанакіраваную работу па захаванні нацыянальных мастацкіх традыцый і актыўную канцэртную дзейнасць".

Акрамя таго, лаўрэатамі прэміі сталі старшы выкладчык кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Канстанцін Касцючэнка, які стварыў манумент "Брама памяці" мемарыяльнага комплексу "Трасцянец" і іншыя творы манументальнага мастацтва, а таксама член грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў" Анатоль Кузняцоў. Ён атрымаў узнагароду за шматгадовую творчую дзейнасць і стварэнне высокамастацкіх твораў жывапісу.

У прэс-службе беларускага Лідара зазначаюць: прыняцце ўказаў аб прысуджэнні прэмій з'яўляецца яркім сведчаннем сталай увагі дзяржавы да пытанняў фарміравання ў беларускім грамадстве здаровай духоўнай атмасферы, развіцця беларускай культуры і мастацтва.

К

Лічба тыдня

834,5 мільярда рублёў —

такая сума выдаткаў на сферу культуры краіны прадугледжана Законам "Аб рэспубліканскім бюджэце на 2016 год", прынятым Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі і адобраным Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі 18 снежня 2015 года. 30 снежня мінулага года Закон быў падпісаны Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. У параўнанні з мінулым годам расходы на сферу культуру краіны запланавана павялічыць на 60,1 мільярда рублёў.

ф о т а ф а к т

Знак у Ашдодзе

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч паведамляе "К", што 29 снежня ў ізраільскім Ашдодзе ўсталявана памятная дошка ў гонар нашага Песняра.

Яўген РАГІН

Ашдод — пяты па колькасці насельніцтва горад у Ізраілі. Тут жывуць выхадцы з 99 краін свету. І тут жа знаходзіцца найбуйнейшае беларускае зямляцтва ў гэтай краіне. Менавіта яно разам з Пасольствам Беларусі ў Ізраілі і муніцыпалітэтам Ашдода стала ініцыятарам знакавай падзеі, якую наш пасол ў Ізраілі Уладзімір Скварцоў назваў другой па важнасці ў 2015 годзе пасля адмены візавага рэжыму паміж нашымі краінамі.

Памятная дошка месціцца на адной з плошчаў новага прэстыжнага мікрараёна. Дарэчы, плошча гэтая носіць імя Янкі Купалы. Справа ў тым, што Ашдод тры гады таму стаў пабрацімам Брэста. І тут ёсць помнік сёмаму прэм'ер-міністру Ізраіля і ўраджэнцу Брэста Менахему Бегіну. А ў Ашдодзе ўзнікла плошча Песняра, а ў яе цэнтры — памятны знак.

Ягоны аўтар — беларускі скульптар Уладзімір Паін, які жыве цяпер у Ізраілі. На дошцы на беларускай мове і іўрыце пазначана: "Янка Купала — народны паэт Беларусі, жыццё і творчасць якога — сапраўдны ўзор міжкультурнага ўзаемадзеяння, талерантнасці і паразумення паміж народамі". Дошку ўпрыгожваюць выява сімвалічнай Папараць-кветкі, якую ўсё жыццё апяваў класік беларускай літаратуры, і факсіміле ягонага подпісу.

Алена Ляшковіч дадае, што падчас ўрачыстага адкрыцця памятнай дошкі Пасол Беларусі ў Ізраілі Уладзімір Скварцоў зачытаў прывітальны адрас ад міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова. Потым у Ашдодскім палацы культуры адбылася прэзентацыя выставы "Сад вашых песень", падрыхтаванай супрацоўнікамі музея.

К

Беларускі народны

Народны каляндар — сістэма сталых ці рухомых свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў быце і фальклоры. Уяўляе пераважна спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культуры. Гэта — фальклорны каляндар: ён складзены на аснове хранонімаў, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў, і ўключае традыцыйныя арыенціры на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах. Утрымлівае традыцыйныя феналагічныя, метэаралагічныя, агранамічныя, астранамічныя, астралагічныя і іншыя каляндарныя веды, атрыманыя пераважна шматгадовым вопытам.

(Пачатак у № 1.)

Ліпень

1. пт. *Дзевятуха. Дзень ад навальніцы.

6. с. Купалле. Свята Сонца і кахання. "Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне".

7. ч. *Дзясятнік. "Дзясятнік гнаі возіць". **Іван Купала.** "Учора была Купала, а сёння Іван".

8. пт. *Дзясятка. "Косы точыць". "Жыта паспявае".

10. н. Самсон. "На Самсона дождж — сем тыдняў то ж". **Сем братоў.** "Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды".

12. а. Пятро. Свята заканчэння Купалля.

13. с. Паўпятро. Дзень талакі. **Сымон і Юда.** "На Сымана й Юды конь баіцца груды".

14. ч. Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. "Святы Пятро жыта спеліць, св. Кузьма сярпы робіць, а св. Дзям'ян сена грабе".

17. н. Андрэй. "Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма". "Андрэй усіх мудрэй".

18. п. Свята Месяца. "Месяц гуляе".

21. ч. Казанская. Пракоп. Пракоп бок прыпёк. **Данат**. "Святы Данат коскі точыць".

25. п. Прокл. Засцерагаліся вялікіх рос. **Якуб.** "На Якуба хлеба поўна губа".

26. а. Гаўрылей. Засцеражэнне ад граду. **Ганна.** Снапы кладзе.

29. пт. Афінаген. Заціхаюць птушкі.

31. н. Серпавіца, Шыпілінка (пятніца перад Іллёю). Дзень "зазубрывання" сярпоў.

Жнівень

1. п. Макрыны. "Глядзі восень па Макрыні".

2. а. Ілья. Свята дажджоў і навальніц. "Ілья нарабіў гнілля", "Укінуў у ваду кусок ільда".

4. ч. Мар'я. "Магдалена — вады па калена".

6. сб. Барыс Палікоп. "Барыс і Глеб — паспеў хлеб".

7. н. Ганны. "Святы Ганны бабкі стаўляюць".

9. а. Палікоп. Паліць копы. **Панцеляймон.** Сцаляў ад хвароб галавы.

11. ч. Лаўрын. "На Лаўрына спяшай да млына".

12. пт. Сіла. Жыта сей.

14. н. Макавей, Першы Спас. Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 28 жніўня.

15. п. Базыль. "Базыль авечкам воўну дае". **Прачыстая, Зельная.** "Прыйшла Прачыста — стала поле чыста".

16.а. Антоны Віхравеі. Рох. "Кірмаш на паненак".

17. с. Еўдакія. Агуркі збірае.

19. пт. Яблычны Спас. Свята садавіны.

23. а. Лаўрэн — свята млынара.

24. с. Баўтрамей. "Св. Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей". "Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей".

27. сб. Міхей. Выспяваюць брусніцы.

28. н. Прачыстая. Свята ўраджаю.

29. п. Трэці Спас. Свята хлеба. **Ян.** "Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў".

30. а. Міроны Ветрагоны. "Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць".

31. с. Фрол і Лаўр. Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** "Сухая" навальніца, дождж.

Верасень

5. п. Лупа. "Сей на Лупа — будзе жыта купа".

7. с. Баўтрамей. "Жыта на зіму сей".

8. ч. Другая Прачыстая. "Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста".

10. сб. Мацей. Абаронца ад п'янства.

11. н. Калінавік, Іван Крыўаўнік.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункта гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 5 553. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 06.01.2016 у 17.30. Замова 190. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Увага! Аб'ява*

У адпаведнасці з пунктам 9 Палажэння аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 300 "Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь", з мэтай шырокага азнаямлення грамадскасці прадстаўляецца інфармацыя аб работах і аўтарскіх калектывах, якія дапушчаны да ўдзелу ў конкурсе на саісканне дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2016 года.

Ад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь

Аб работах, дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2016 года

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2016 года дапушчаны наступныя работы і аўтарскія калектывы:

Драган Вячаслаў Ігнацьевіч, Пойта Пётр Сцяпанавіч, Тур Віктар Уладзіміравіч, Шалабыта Мікалай Мікалаевіч, Мухін Анатолій Віктаравіч. Работа "Распрацоўка, даследаванне і шырокае ўкараненне ў практыку будаўніцтва эфектыўнай металічнай структурнай канструкцыі сістэмы "БрДТУ", якая прымяняецца пры ўзвядзенні вялікапралётных, у тым ліку ўнікальных, пакрыццяў збудаванняў". Вылучана ўстановай адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт". Прадстаўлена Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Румо Алег Алегавіч, Астроўскі Юрый Пятровіч, Дзядзько Аляксандр Міхайлавіч, Калачык Алег Валянцінавіч, Шчэрба Аляксей Яўгеньевіч, Валенцюкевіч Андрэй Валянцінавіч. Работа "Распрацоўка і ўкараненне тэхналогій трансплантацыі органаў у дзяцей і дарослых". Вылучана ўстановай аховы здароўя "9-я гарадская клінічная бальніца". Прадстаўлена Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Грабчыкаў Сяргей Сцяпанавіч, Зайцаў Валерый Аляксандравіч, Кавальчук Генадзій Піліпавіч, Саладуха Віталій Аляксандравіч, Чыжык Сяргей Антонавіч, Шведаў Сяргей Васільевіч. Работа "Распрацоўка і арганізацыя прамысловай вытворчасці экспартнаарыентаваных мікраэлектронных вырабаў двайнога і спецыяльнага прызначэння на аснове стварэння сучасных метадаў праектавання, паўправадніковых тэхналогій і высокадакладнага аналітычнага і зборачнага абсталявання". Вылучана ААТ "ІНТЭГРАЛ" — кіруючая кампанія холдынгу "ІНТЭГРАЛ". Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь; Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Ляўко Вольга Мікалаеўна, Дук Дзяніс Уладзіміравіч. Работа "Вытокі беларускай дзяржаўнасці: Полацкая і Віцебская землі ў IX — XVIII стагоддзях". Вылучана дзяржаўнай навуковай установай "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Пархомчык Пётр Аляксандравіч, Сцяпук Алег Георгіевіч, Трухноў Леанід Іванавіч, Сямёнаў Леанід Віктаравіч, Кашэўскі Яўгеній Пятровіч, Наскавец Аляксандр Міхайлавіч. Работа "Распрацоўка звышцяжкага кар'ернага самазвала БЕЛАЗ-75710 рэкорднай грузападымальнасцю 450 тон". Вылучана ААТ "БЕЛАЗ" — кіруючая кампанія холдынгу "БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ". Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Сцяпук Леанід Якаўлевіч, Марыніч Леанід Адамавіч, Лапа Віталій Вітальевіч, Перавознікаў Васілій Мікалаевіч. Работа "Стварэнне і ўкараненне ў сельскагаспадарчую вытворчасць комплексаў машын, якія вызначаюць выніковасць земляробства і жывёлагадоўлі Рэспублікі Беларусь". Вылучана РУП "НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі". Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Рупасава Жанна Аляксандраўна, Рашэтнікаў Уладзімір Мікалаевіч, Ціток Уладзімір Уладзіміравіч, Паўлоўскі Мікалай Баляслававіч, Якаўлеў Аляксандр Паўлавіч, Лягускі Васілій Рыгоравіч. Цыкл работ "Інтрадукцыя і ўвядзенне ў прамысловую культуру на меліяраваных землях і выбыўшых з прамысловай эксплуатацыі тарфяных радовішчах Беларусі паўночнаамерыканскіх відаў верасовых (журавіны буйнаплодныя, буякі высакаслыя) і сартавых брусніц". Вылучана ДНУ "Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі". Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Прывалаў Фёдар Іванавіч, Грыб Станіслаў Іванавіч, Казлоўская Зоя Аркадзьеўна, Кільчэўскі Аляксандр Уладзіміравіч, Кавалевіч Аляксандр Іванавіч. "Стварэнне банка генетычных рэсурсаў сельскагаспадарчых і лясных раслін для забеспячэння харчовай і біялагічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь". Вылучана РУП "Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве". Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Герман Андрэй Аляксандравіч, Кандратчык Валерый Аркадзьевіч, Маскаленка Павел Віктаравіч, Дзмітраковіч Андрэй Аляксандравіч, Вашкевіч Грэнальд Міхайлавіч, Косінаў Яўгеній Сямёнавіч. Работа "Распрацоўка і асваенне вытворчасці сістэмы машын лесапрамысловага комплексу АМКАДОР". Вылучана ААТ "АМКАДОР" — кіруючая кампанія холдынгу". Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2016 года дапушчаны наступныя аўтары і творчыя калектывы:

Волкава Аксана Уладзіміраўна, Масквіна Настасся Ігараўна, Трыфанаў Станіслаў Уладзіміравіч, Франкоўскі Сяргей Уладзіміравіч, Ламановіч Ніна Іосіфаўна, Касцючэнка Аляксандр Аляксандравіч. За значныя творчыя дасягненні ў развіцці музычнага мастацтва, прапаганду духоўных каштоўнасцей і значны асабісты ўклад у пастаноўку опернага спектакля на музыку Дз.Смольскага "Сівая легенда" па творы У.Караткевіча. Вылучаны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установай "Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Крэпак Барыс Аляксеевіч. За серыю кніг і альбомаў пра жыццё і творчасць дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі. Вылучаны ГА "Беларускі саюз мастакоў". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пазнякоў Міхаіл Паўлавіч. За кнігі для дзяцей "У родным краі", "Гульняслоў", "Серабрыстыя чайкі". Вылучаны ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Алай Анатолій Іванавіч. За цыкл дакументальных фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну "Яго закапалі ў шар зямны", "Чорная дарога", "Адрынуты", "Салдаты Італіі", "За два крокі ад Гільяціны", "Чырвоны д'ябал", "Пётр Конюх", "Георгій Жукаў. Вайна і мір маршала Перамогі", "Бумеранг". Вылучаны ГА "Беларускі саюз кінематаграфістаў". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кандрусевіч Уладзімір Пятровіч. За значныя дасягненні ў галіне тэатральнага і музычнага мастацтва, стварэнне музыкі да балета "Мефісто", мюзіклаў "Шклянка вады", "Джулія", "Соф'я Гальшанская", "Байкер". Вылучаны ўстановай "Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Янкоўскі Расціслаў Іванавіч. За выдатнае ўвасабленне вобразаў класічнай замежнай і сучаснай айчыннай драматургіі ў спектаклях "Сунічная паляна" І.Бергмана, "Праўда — добра, а шчасце лепш" А.Астроўскага, "Пане Каханку" А.Курэйчыка, "Гора ад розуму" А.Грыбаедава. Вылучаны ДУ "Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Казінец Міхаіл Антонавіч, Крамко Аляксандр Яўгеньевіч, Сімаковіч Ларыса Іванаўна. За стварэнне канцэртаў-спектакляў тэтралогіі "Святое, незабыўнае…" (музычна-тэатралізаваныя пастаноўкі "Гусляр", "Апокрыф", "Песня пра долю", "Люцыян Таполя"). Вылучаны ўстановай "Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Буралкін Генадзій Васільевіч, Занковіч Валянцін Паўлавіч, Федчанка Сталін Іванавіч. За стварэнне мемарыялаў і скульптурных груп пагранічнай тэматыкі ў перыяд 2004 — 2011 гадоў. Вылучаны Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь. Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне навукі і тэхнікі, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі спецыялістаў, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі па работах, аўтарскіх калектывах і аўтарах прымаюцца да 15 верасня 2016 года па адрасе: 220072, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 66, каб. 317, 413, сакратарыят Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Тэл. (017) 284-11-63; тэл. / факс (017) 284-24-56, (017) 284-23-81.

каляндар на 2016 год

13. а. Кіпрыян. Журавель збіраецца ў вырай.

14. с. Сымон. Абрад "жаніцьбы коміна". (Асенняе Навалецце з 1493 года). Закрыванне зямлі. **Бабіна лета. Узвіжанне.**

19. п. Цуды, Міхал. "Міхал з поля спіхаў".

21. с. Багач, Нараджэнне Божае Маці. Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

24. сб. Асенняе раўнадзенства. Усход сонца — 7.00, захад — 19.02.**Тадора.** "На Тадору ўсякае лета заканчваецца".

26. п. Стаўроўскія Дзяды.

27. а. Звіжанне. Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі — у кучу.

29. ч. Міхал. "Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі". **Сіцыян.** "Святы Сіцыян да ляны пасцілаў".

Кастрычнік

2. н. Зосім. Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

3. п. Астап, Астаф'я. Прыкметы па ветру.

4. а. Пранцішак, Францішак. "На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка".

8. сб. Сяргей. Жалезны тыдзень.

9. н. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў. Шапталіся свахі пра нявест.

14. пт. Пакровы, Трэцяя Прачыстая. Вясельная пара. "Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам". "Пакровы — зарыкалі каровы". **Дзявоцкае лета** (па 21.10). Прымалі "ў дзеўкі" сяброўак.

21. пт. Трыфан, Палагея. "Золкім ветрам вее". **Зміцер.** "Да Змітра баба хітра".

25. а. Марцін — свята млынароў.

28. пт. Сымон і Юда. "Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць". **Параскева Пятніцкая.** Забарона на прадзенне.

29. сб. Лонгін. Збавіцель ад хвароб вачэй.

30. н. Паклоны. Дзень адбівання паклонаў.

31. п. Лука. "Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі". Дзень іканапісцаў. **Юльян** — ахоўнік дзяцей.

Лістапад

1. а. Усе святыя. Памінальны дзень.

2. с. Задушны дзень. Памінальны дзень.

4. пт. Казанская. Дождж ці снег.

5. сб. Асяніны, Зміцраўскія Дзяды. "Святыя дзяды, завём вас…".

8. п. Зміцер. "Да Змітра дзеўка хітра". Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

9. а. Тодар. "На Тадора поўна камора".

10. с. Параскі. Апякунка жанчын і рукадзелля.

11. ч. Настуся. Настуся стрыжэ авечкі. **Марцін.** "Мядзведзь кладзецца ў бярлогу".

12. пт. Артошка. Пачатак прадзення.

14. н. Кузьма-Дзям'ян. Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

21. пн. Міхайлаў дзень. Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

22. а. Матрона. "З Матроны становіцца зіма".

24. ч. Хвёдар Студзянец. "Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць".

25. пт. Іван Міласцівы. Дзень падарункаў. **Кацярыны.** "Кацярына забрала лета".

27. н. Юстыніян. Апякун плоднасці і дзяцінства. **Адвент.** Перадкалядны пост. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпаўскага посту (да 7 студзеня).

28. п. Піліпаўка — перадкалядны пост.

29. а. Мацей. "На Мацея зіма пацее".

30. с. Андрэй. Дзявочае свята.

Снежань

4. н. Увядзенне. Водзяцца ваўкі. **Барбара.** "Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла".

5. п. Пракоп. Савы. "Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае".

6. а. Матрыхваны. Не пралі. **Мікола.** "Хвалі зіму па Міколе".

7. с. Кацярыны. "Забрала край лета".

9. пт. Юр'е Зімовы. Юра мосціць. **Ганны.** "Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні".

13. а. Андросы, Андрэйкі. Варажылі.

14. с. Навум. Наставіць на вум.

17. сб. Варвары. "Мікола і Варвара ноч урвалі".

18. н. Савы, Міколін бацька. "Сава мосце, а Мікола гвоздзе".

19. п. Мікола Зімовы. "Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета". "Мікола марозам гвоздзіць". Усход сонца — 9.25, захад — 16.49. Зімовае сонцастаянне — з 19.12 да 22.12.

22. ч. Ганны. "Ганкі — сядайце на санкі".

24. сб. Посная куцця. Пачатак Каляд (да 6 студз.).

25. н. Спірыдон Сонцаварот. Божае Нараджэнне.

26. п. Сцяпан. "Кожны сабе пан".

31. сб. Марк. "Марка да Варка — няхай будзе парка". **Багатая куцця. Сільвестр.** Варажылі дзяўчаты.

Алесь ЛОЗКА, фалькларыст

Умоўныя абазначэнні:
п. *— панядзелак,* **а.** *— аўторак,* **с.** *— серада,* **ч.** *— чацвер,* **пт.** *— пятніца,* **сб.** *— субота,* **н.** *— нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу сонца і захаду падаюцца для Мінска.*

Дзяжурны па нумары

Геройскія часы

Калі навагоднія святы адгрымелі, то з'явіўся час паразважаць пра тое, што было на вачах гэтымі днямі. У мяне, так ужо сталася, — ранішнікі. Прычым у зайздроснай колькасці. Сваіх дзяцей у мяне пакуль няма, але пасля навагодняга тыдня так захацелася, каб яны як мага хутчэй з'явіліся. Прынамсі, гледзячы на тое, што з імі, дзецьмі, можна рабіць.

Аліна САЎЧАНКА / Фота аўтара

Ніколі не задумвалася над тым, што касцюмы малых на навагодні ранішнік могуць быць такімі гаваркімі. І адлюстроўваць агульнаграмадскія тэндэнцыі, густ, захапленні, узровень інтэлектуальнага развіцця, тыя ці іншыя ідэі…

Дзіцячыя святочныя касцюмы ў Беларусі XXI стагоддзя зараз вельмі лёгка класіфікуюцца. На проста прыгожыя: сукенкі, кашулі, чаравічкі, банты, маскі і гэтак далей. На гістарычна нам звыклыя (з дасавецкіх і савецкіх часоў): вавёрачкі, сняжынкі, зайчыкі, снягуркі, анёлы і мальвіны. На сусветную класіку ўсіх часоў і народаў: піраты, эльфы, каўбоі, мушкецёры, іншапланецяне. Ну і на новыя павевы, калі казаць менавіта пра беларусаў: спайдэрмэны, бэтманы, сонікі ікс, зора, дыснэеўскія прынцэсы…

Адчувалася, што тыя маскарады арганізаваны не толькі, каб парадаваць дзяцей. Гэта і бацькоўскія спаборніцтвы ў справе вынаходніцтва і арыгінальнасці. І нічога дрэннага ў тым не бачу, хутчэй — канстатую факт. Нашы парасткі маюць магчымасць і Дартам Вэйдарам адчуць сябе, і Халкам, і Рапунцэль, і Чабурашкам. З дапамогай старэйшых, канешне.

Зразумела, ніякіх айчынных персанажаў я на шэрагу гэтых ранішнікаў не сустрэла. Чаму "зразумела"? Мо таму, што няма ў нас такіх культавых прывабных герояў з кніжак, мультфільмаў, коміксаў ці проста выцягнутых з масавай культуры (хіба хакейны зубр з апошніх гадоў). І сапраўды, ну не ў Міколку ж Паравоза апранацца дзецям? Хаця можна звярнуцца да той жа міфалогіі. Наш фальклор багаты на незвычайных і адметных істот кшталту русалак ці дамавікоў, перуноў ці зюзяў. Можна, урэшце, "пагуляць" з адаптацыяй вобразаў гістарычных асоб — кагосьці з тых жа Радзівілаў ці Агінскіх, Вітаўта ці Рагнеды. Ды мой каменьчык не ў гарод бацькоў паляцеў. Грамада, за рэдкім выключэннем, спажывае тое, што культывуецца наўкола.

Асобнай увагі заслугоўваюць сцэнарыі для ранішнікаў. З вышыні маіх гадоў (ха-ха-ха, насамрэч я сама нядаўна чытала вершы пад такой жа елкай) бачу, як моцна халтураць на гэтай справе. І становіцца крыўдна, бо дзеці зараз максімальна разумныя, кемлівыя, прагрэсіўныя, а прапаноўваюць ім нейкае "шыла", як той казаў. "Дзіцячыя карпаратывы" сталі добрай нагодай зарабіць ці, наадварот, сэканоміць. Навошта напружвацца, калі можна "начыніць" сюжэт папсовымі Машай і Мядзведзем, фіксікамі, смяшарыкамі (зноў жа, беларуская анімацыя не ў трэндзе). Вышэйназваныя карціны нельга не адзначыць як якасныя ("Маша і Мядзведзь" увогуле зараз абсалютны хіт у Еўропе). Але ж тое, як жорстка і часцяком бесталанна эксплуатуюцца гэтыя мульцікі, можна лічыць злачынствам і ў адносінах да інтэлектуальнай маёмасці, і да дзяцей і іх псіхікі.

На адным з наведаных аўтарам ранішнікаў.

Новы час патрабуе новых лідараў, герояў. Для дзіцячага ўспрымання ў тым ліку. Мы хочам верыць у станоўчую, харызматычную, непрымітыўную асобу, хай сабе і кіношную. Гэта адчувальна нават па тым, што я бачыла на ранішніках, падрыхтаваных як прыватнымі, так і дзяржаўнымі калектывамі. Дзецям і дарослым не хапае больш увасабленняў дабра і справядлівасці. Можа, менавіта таму з'явіліся і Пітар Паркер, і Гары Потар. І калі нашы творцы такіх прыкладаў не даюць, то мы і надалей будзем пазычаць іх у замежжы. Інакш не атрымаецца? А можа, галоўнае, каб у нашых дзяцей увогуле былі героі і добрыя прыклады перад вачыма.

К

Пытанне вырашыць… пятля?

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Мы імкнемся растлумачыць, што ДММШМ, куды дзеці прыходзяць на некалькі гадзін пасля агульнаадукацыйнай школы, не патрабуе вялікай прылеглай тэрыторыі, спартыўнай пляцоўкі, гаспадарчых блокаў. Установы дадатковай адукацыі спрадвеку спакойна абыходзіліся без кропак грамадскага харчавання (сталовых, буфетаў). Мне падаецца, тэма гэтая не да канца закрытая. Магчыма мы прыйдзем да якога-небудзь кампрамісу ў плане ўзвядзення новага будынка, — дадае суразмоўца.

Спадарыня Куеўда згодная на варыянт, калі ў навабуд пераедуць толькі музыканты (адміністрацыя Маскоўскага раёна сталіцы абяцае пры неабходнасці знайсці дадатковыя плошчы для мастацкага аддзялення). У гэтым выпадку спатрэбіцца меншае па аб'ёме і павярховасці памяшканне, значыць, ёсць шанец упісацца ў новыя санітарныя нормы. Толькі б не спазніцца, пакуль зямельны ўчастак яшчэ не заняты…

Пад'езд з музычным паверхам

Праз змены ў заканадаўстве дырэктару ўстановы прапанавалі разгледзець магчымасці размяшчэння школы ва ўбудаваных памяшканнях. Умоўна кажучы, калі побач здадуць шматкватэрны дом, то першы паверх, які запланаваны пад нежылы фонд, могуць перадаць ДММШМ №1.

Усё бліжэй да школы мастацтваў падступае будаўнічая тэхніка. / Фота аўтара

— Некалькі варыянтаў я глядзела, — працягвае Жанна Валер'еўна. — Але ёсць праблема: ці змогуць праекціроўшчыкі прадугледзіць якасную гукавую "шапку"? Мы прагаворвалі гэты момант з прадстаўнікамі Упраўлення капітальнага будаўніцтва: неабходна вялікае па метражу памяшканне з добрай акустыкай і пры гэтым — ідэальнай гукаізаляцыяй, каб не турбаваць жыхароў. Не ведаю, наколькі тое магчыма…

На мой погляд, прапанова нават гучыць неверагодна. Колькі коп'яў было зламана на інтэрнэт-форумах (і не менш ляжыць скарг у ЖЭСах), калі ў панэльным доме ў суседзяў грае адно піяніна, а тут пад жылым фондам з 8 да 20 будзе рэпеціраваць цэлая музычная школа! Хаця, канешне, у фінансавым плане такі праект выглядае больш прывабна: грошай ён пацягне менш, чым узвядзенне з нуля навабуда…

Ды адной гукаізаляцыяй праблемы першых паверхаў не заканчваюцца. Аглядаючы прапанаваныя месцы, мая суразмоўца адзначыла, што ўсе памяшканні падзелены шматлікімі апорнымі калонамі (гэта архітэктурная неабходнасць: інакш гмах не зможа трывала стаяць). Калі з улікам гэтага нюансу класы яшчэ можна запланаваць, то прадугледзець актавую залу амаль немагчыма. Апошняя — не проста пляцоўка для канцэртнай дзейнасці, яна — частка няспыннага навучальнага працэсу, распісаная штодня пагадзінна для работы шматлікіх калектываў, у тым ліку і ўзорнага. На базе школы мастацтваў № 1 працуюць гарадскія метадычныя секцыі па цымбалах і фартэпіяна, ладзяцца метадычныя канферэнцыі для двух дзясяткаў сталічных школ мастацтваў, майстар-класы профільных ВНУ і каледжаў, гарадскія адборачныя туры да міжнародных конкурсаў і гэтак далей. Каб падтрымліваць сённяшні ўзровень, сапраўды патрэбная зала з добрай акустыкай і неабходнай умяшчальнасцю.

Сюіта пад грукат экскаватараў

Як вырашыць?

Неаднойчы ў размовах з прадстаўнікамі профільных устаноў розных ступеняў адукацыі я чула нараканні на значнае скарачэнне колькасці ахвотных прыйсці да іх навучацца. У школы мастацтваў №1 нават пытання такога не паўстае: па некаторых спецыяльнасцях — у прыватнасці, фартэпіяна, гітара, вакал, эстрадны напрамак — конкурс даходзіць да 12 чалавек на месца! Магчыма, таму спрыяе ўдалае геаграфічнае месцазнаходжанне: сюды едуць з бліжэйшых мікрараёнаў Маскоўскага і Фрунзенскага раёнаў сталіцы. Дарэчы, запланаваныя дамы па суседстве з ДММШМ №1 пазначаны ў якасці жылля для шматдзетных сямей, такім чынам, у хуткім часе наплыў патэнцыйных музыкантаў павялічыцца.

Узнікала размова размеркаваць вучняў на пэўны перыяд па часовых кропках. Але куды падзенуцца ўсе гэтыя дзеці, калі класы размяркуюць па іншых месцах? Педагагічны склад упэўнены, што ў гэтым выпадку згубіць значную частку навучэнцаў, а ад гэтага пацерпіць выніковасць і перспектыўнасць навучання… Зрэшты, спадарыня Куеўда сумесна з начальнікам упраўлення адукацыі Алай Куніцкай вывучала пытанне, шукаючы вольныя памяшканні ў Маскоўскім раёне, аднак не знайшла іх у патрэбнай колькасці.

— Але каб яны і з'явіліся… Вялікіх выдаткаў каштуе транспарціроўка з месца на месца інструментальнага фонду, які ў нас досыць сур'ёзны. Прынамсі, мы маем чатыры раялі, адзін з якіх — ручной работы, і мы ім вельмі ганарымся. Каб адправіць адпаведна ўсіх правілаў толькі адзін з іх, неабходна знайсці траціну ад кошту новага інструмента! — тлумачыць дырэктар. — Гэта ў выпадку, калі пасля перасялення яго не спатрэбіцца рамантаваць. Што мы атрымаем? Магчыма, танней накіраваць гэтыя грошы на будаўніцтва новага ці капітальны рамонт старога будынку?…

Трэба зазначыць, што адміністрацыя школы вельмі трапятліва ставіцца да цяперашняга будынка. Усе вокны заменены на шклопакеты, усталявана добрая ўваходная група, адпавядае нормам пажарнай бяспекі група запаснога выхаду, зала забяспечана кандыцыянерамі, усе класы маюць неабходнае абсталяванне. Таму ўсё часцей узнікаюць размовы, а мо праекціроўшчыкі і камунальшчыкі прадугледзяць у гэтым месцы пятлю, каб усё ж пакінуць будынак на месцы… Дырэктару падаецца такое развіццё падзей самым кампрамісным па фінансаванні. У гэтым выпадку школа зможа прэтэндаваць на капітальны рамонт у будучым і ўзвядзенне другога паверха, што, у сваю чаргу, дазволіць выкарыстаць увесь прафесійны патэнцыял, які маецца на сёння, дапаможа стварыць новыя калектывы з ліку навучэнцаў.

У "чырвоную кнігу"?

Колькі яшчэ школа мастацтваў № 1 будзе жыць на ростанях верагоднага зносу — невядома. "Мы разумеем, што навучальны працэс спыняць нельга. Многія з нашых выхаванцаў рыхтуюцца да сур'ёзных конкурсаў, будучыя выпускнікі распачалі рэпетыцыі нумароў для паступлення ў профільныя каледжы. Нам патрэбна прадаставіць ім годныя ўмовы, але даволі складана настроіцца на плённую вучобу, калі экскаватары падбіраюцца ўсё бліжэй", — тлумачыць хваляванні бацькоў Жанна Валер'еўна.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска Уладзімір Танкевіч просіць бацькоў не турбавацца; у размове з карэспандэнтам "К" ён некалькі разоў падкрэсліў, што дзяцей без памяшкання не пакінуць, ніхто не будзе высяляць навучэнцаў, пакуль не знойдзецца неабходны будынак.

— У сталіцы ў планах пад знос знаходзіцца каля двух тысяч дамоў, але для такога кроку неабходна знайсці фінансаванне, — нагадаў Уладзімір Валер'евіч. — Пакуль ўзвядзенне новай музычна-мастацкай школы не ўключана ў інвестпраграму Мінска. Адміністрацыя Маскоўскага раёна рыхтуе старшыні гарвыканкама дакладную запіску, якая хутка з'явіцца на яго стале. Мы прапануем уключыць гэты аб'ект у інвестпраграму ці перанесці на нейкі тэрмін пашырэнне праезджай часткі гэтага адрэзку вуліцы Алібегава (мы знайшлі варыянт, як можна перакласці інжынерныя сеткі і пабудаваць усе запланаваныя дамы). Пытанне са зносам школы можна адкласці да той пары, пакуль не знойдуцца грошы на вырашэнне праблемы.

■■■

Між тым, час задумацца, колькі дзесяцігоддзяў прайшло з таго моманту, як у беларускай сталіцы апошні раз з'явіўся спецыяльна ўзведзены для музычнай школы ці школы мастацтваў будынак. Ведаю, што меркавалі ўзвесці такі ў Сухараве, але так і не адбылося… Горад узялі ў абдымкі велізарныя жылыя масівы накшталт Каменнай Горкі, Лошыцы, але бадай ніводнай культурнай установы (апроч, хіба, бібліятэк) у гэтых раёнах не з'явілася. Магчыма, гэта пытанне наступнай чаргі будаўніцтва? Інакш такія аб'екты хутка можна будзе ўключаць у своеасаблівую "чырвоную кнігу" горада…

Спадзяюся, тыя, ад каго залежыць лёс ДММШМ №1, змогуць сапраўды вырашыць сітуацыю, каб таленавітыя дзеці атрымалі магчымасць займацца ў будынку, які будзе адпавядаць статусу сучаснай сталічнай музычна-мастацкай школы. А "К" яшчэ вернецца да тэмы. Як хацелася б, каб наступны матэрыял загучаў у мажорнай танальнасці…

К

Абвяшчаючы 2016-ы Годам культуры, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў сваім Указе артыкуляваў мэты "аб'яднання інтэлектуальных і духоўных сіл грамадства для вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця народных традыцый, выхавання ў грамадзян любові да Айчыны, а таксама падтрымкі творчых ініцыятыў". Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў, што паняцце "культура" ахоплівае не толькі мастацкую творчасць (як часта звужана разумеюць яго сёння), але літаральна ўсе сферы чалавечай дзейнасці.

У сваім інтэрв'ю для радыё "Беларусь", удзел у якім узялі таксама і прадстаўнікі іншых СМІ (у тым ліку і "К"), міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ акрэсліў некаторыя прыярытэтныя вектары працы галіны ў гэты незвычайны для яе год.

Барыс Святлоў падчас інтэрв'ю. / Фота Аліны САЎЧАНКА

Надзеі і планы Года культуры

Міністр культуры акрэсліў прыярытэтныя вектары працы

Суплёт юбілеяў

— Ініцыятыва абвясціць 2016-ы Годам культуры нарадзілася ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі і, як мы бачым, атрымала падтрымку на самым высокім узроўні. Лічу, зоркі склаліся вельмі ўдала: 2016-ы пройдзе пад гэтым знакам зусім невыпадкова. Паглядзіце, колькі важных юбілеяў прыпадае на гэты год! Тут і 125-я ўгодкі Максіма Багдановіча, і 120-я гадавіна Кандрата Крапівы, і 95-годдзе Івана Шамякіна, і 75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна… Зразумела ж, у праграме Года культуры будзе адведзена пачэснае месца для ўшанавання гэтых знакавых для Беларусі постацяў.

Таксама варта нагадаць і пра яшчэ адзін вельмі важны юбілей — знакаміты ці не на ўвесь свет "Славянскі базар у Віцебску" адсвяткуе сёлета сваё 25-годдзе. Няма сумневу, што гэты форум мастацтва і сяброўства стане адной са знакавых падзей культурнага жыцця краіны.

Да ўсяго, сёлета нам нельга забываць і пра тыя знакавыя даты, якія прыпадаюць ужо на наступны, 2017-ы, год — а сярод іх і 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, і 135-я ўгодкі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Таму ў найбліжэйшай будучыні нас чакае руплівая праца па падрыхтоўцы гэтых маштабных святкаванняў.

Ад Курска да Пекіна

— Міжнародная дзейнасць у галіне культуры ажыццяўляецца як у традыцыйных формах — перадусім гэта абменныя Дні культуры, якія ладзіць наша Міністэрства са сваімі замежнымі партнёрамі, — так і дзякуючы ініцыятывам канкрэтных установаў альбо нават асобаў. Прыкладам, акурат надоечы меў размову з дырэктарам Дзяржаўнага мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаідай Камароўскай, якая выступіла з ініцыятывай, каб у Курску і Ташкенце з'явіліся вуліцы, названыя ў гонар беларускага Песняра. Безумоўна, Урад будзе прыкладаць намаганні ў гэтым кірунку.

Важнай тэндэнцыяй апошняга часу стала ўзмацненне культурных сувязяў з Кітаем. Яны распачаліся яшчэ ў першыя гады існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь, але менавіта леташні візіт у Рэспубліку Беларусь Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна паслужыў моцным штуршком для адкрыцця новых далягляда ў супрацоўніцтва. У прыватнасці, у хуткай перспектыве чакаецца адкрыццё Культурнага цэнтра Беларусі ў Пекіне. Прычым тут важна адзначыць і наступную акалічнасць: калі раней кантакты адбываліся пераважна праз сталіцу Кітая, дык апошнім часам умацоўваюцца сувязі і непасрэдна з яго тэрытарыяльнымі часткамі. Сёлета мы плануем разам з правінцыяй Ганьсу правесці Дні кітайскай культуры ў Беларусі.

Пра спадчыну і турызм

— Нягледзячы на тое, што ў эканамічным плане 2016 год чакаецца даволі няпростым, працягнецца праца па адраджэнні нашых гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Зусім нядаўна мне даводзілася наведваць Брэсцкую вобласць, і мы разам з мясцовымі ўладамі вызначылі парадак фінансавання работ па рэстаўрацыі палацавых комплексаў у Косаве і Ружанах. Зважаючы на згаданыя цяжкасці, у першую чаргу мы маем намер сканцэнтраваць увагу менавіта на тых аб'ектах, дзе рэстаўрацыйныя работы ўжо набліжаюцца да завяршэння. І няма сумневу, што ў хуткім часе яны стануць новымі турыстычнымі адметнасцямі, якія працуюць на імідж нашай краіны.

Увогуле, варта спадзявацца, што той надзвычай багаты суплёт разнастайных мастацкіх падзей, які чакаецца ў Год культуры, таксама стане фактарам прыцягнення турыстаў, паспрыяе іх колькаснаму (а можа, і якаснаму) росту. У значнай меры гэта тычыцца і рэгіёнаў Беларусі. У прыватнасці, адным са своеасаблівых эпіцэнтраў Года культуры (а яны былі абраны ў кожнай вобласці) стане старадаўні Полацк, мноства цікавых мерапрыемстваў чакаецца таксама і ў сёлетняй культурнай сталіцы Маладзечне.

І ўрэшце — пра заробкі

— Цяжка не пагадзіцца з тым, што актуальная праблема галіны — нізкія заробкі тых, хто шчыруе на ніве культуры. Мушу запэўніць: наша Міністэрства робіць несупынныя захады па выпраўленні гэтай сітуацыі. Спадзяюся, што ў гэтым годзе нам удасца змяніць яе да лепшага.

К

Прэмія як брэнд

меркаванне

Вячаслаў БАРТНОЎСКІ, прафесар БДУКіМ, ганаровы акадэмік Міжнароднай гуманітарнай акадэміі "Еўропа — Азія", старшыня журы Міжнароднай прэміі "БелБрэнд"

Днямі ў Мінску адбылося чарговае ўручэнне Міжнароднай музычнай прэміі "БелБрэнд" і, па сутнасці, яе першая такая шырокая грамадская прэзентацыя — у рамках Міжнароднага форуму "Антыкантрафакт-2015".

У Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся гала-канцэрт "Музыканты ў абарону брэндаў". Лаўрэаты выступілі ў атачэнні прызнаных зорак — у суправаджэнні вялікага сімфанічнага аркестра "Collegium Musicum" пад маім кіраўніцтвам. Урачыстасці надаў вечарыне і ўдзел такога знанага калектыву, як Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Рыгора Шырмы.

Прэмія гэта з'явілася толькі летась. І была тады ўручана піяністу Аляксандру Музыкантаву і віяланчэлісту Аляксею Кісялёву, майстэрства якіх высока ацэнена ў нас і ў замежжы. Увогуле ж, разлічваць на яе могуць маладыя музыканты з дзяцінства да 31 года, маючы значныя дасягненні міжнароднага маштабу. Журы, складзенае з прызнаных мэтраў айчыннага і замежнага мастацтва, само вылучае магчымых намінантаў, кандыдатуры якіх потым абмяркоўваюцца. Але заяўкі на ўдзел могуць дасылаць і самі прэтэндэнты, прыклаўшы неабходныя дакументы і відэазапісы. Сёлета, да прыкладу, было пададзена каля 50 заявак з 14 краін. Сярод узнагароджаных — такія вядомыя артысты, як оперны прэм'ер Ілья Сільчукоў, эстрадная прымадонна Іскуі Абалян, піяніст-віртуоз Павел Нетук, зусім яшчэ юны фартэпіянны дуэт у складзе Дар'і і Настассі Лукашэнкаў, якія вучацца ў сталічнай Дзіцячай музычнай школе імя Яўгена Глебава, і іншыя.

Даведаўшыся пра з'яўленне прэміі, некаторыя здзіўляліся: маўляў, пры чым тут назва "БелБрэнд", якая больш асацыюецца з прамысловай прадукцыяй, чым з культурай, а тым больш музыкай? Але брэнд — гэта, па сутнасці, знак якасці. І наша нацыянальная выканальніцкая школа — таксама брэнд. Гэта прэмія, лічыце, упершыню звяртае ўвагу не толькі на лаўрэатаў конкурсаў, але і на тых, хто іх рыхтуе, на выкладчыкаў, якія часта застаюцца ў ценю. Ды, па вялікім рахунку, ужо сама па сабе нацыянальная культура як адна з найбольш яркіх праяў ідэнтыфікацыі нацыі — брэнд любой краіны.

У будучым плануецца пашыраць намінацыі, уключыць туды маладых даследчыкаў і навукоўцаў, праводзіць навуковыя канферэнцыі, звярнуць асаблівую ўвагу не толькі на пытанні аўтарскага права, але і на праблемы працаўладкавання маладых музыкантаў, а таксама на балявыя кропкі нашай музычнай адукацыі — у прыватнасці, на неабходнасць вярнуць скасаваную колькі гадоў таму асістэнтуру-стажыроўку. Бо музыканты-выканаўцы, у адрозненне ад прафесійных музыказнаўцаў, павінны ўдасканальваць сваё вакальнае, інструментальнае, дырыжорскае майстэрства, а не марнаваць час на напісанне дысертацый, забыўшыся на сваю асноўную спецыяльнасць.

Перспектыўным уяўляецца і тое, што гэта прэмія, заснаваная Асацыяцыяй "БелБрэнд" пад патранатам Еўразійскай эканамічнай камісіі, так ці інакш яднае культуру з эканомікай. А значыць, садзейнічае іх далейшым узаемасувязям, якія могуць быць карыснымі для абодвух бакоў. Не толькі ўзнімае і падтрымлівае маладыя таленты, але і выхоўвае магчымых спонсараў — цяперашніх і будучых, што вельмі важна для далейшага развіцця і росквіту мастацтва.

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Музыка ў гандлёвых сетках

меркаванне

Алег ЧЫЖЫК, кампазітар і гукарэжысёр

У наш век музыка гучыць літаральна паўсюль, на ўсіх уплывае, нават кіруе паводзінамі сваіх часам міжвольных слухачоў. Напрыклад, у крамах яе часцяком выкарыстоўваюць для "стымулявання продажаў". І тое самае — кавярні, салоны прыгажосці…

Але падабраная яна зазвычай вельмі няўдала, бо гэты рытмічны зацыклены "бум-бум" па галаве, які мы чуем у большасці выпадкаў, выклікае ў пакупнікоў хіба псіхічнае знясіленне. Не ўпэўнены, што крамныя "дзі-джэі" вывучалі працы той жа Бехцеравай аб падборы даўжыні музычных фразаў, каб пазбегнуць самнамбулічнага стану.

Чым яны наогул кіруюцца? Вось цытата "з іх лагеру": "Музыка фармуецца з улікам часу сутак, сезоннасці, мэтавай групы". Ім нават у галаву не прыходзіць, што характар музыкі павінен змяняцца па законах драматургіі — вядома, калі яны ставяць перад сабой мэту выклікаць у пакупнікоў станоўчае ўспрыняцце крамы. Хаця б паклікалі сапраўднага дзі-джэя пракансультавацца!

З аднаго боку, я наогул супраць прыхаванай маніпуляцыі людзьмі. З іншага… Як кампазітар, я за тое, каб музыка — няхай і ў гандлёвых сетках таксама — цешыла, кранала, абуджала сілы жыцця. У крызіс гэта асабліва актуальна.

Між іншым, "утылітарная" музыка існавала і шмат гадоў таму. У XVIII стагоддзі яна будавалася па драматургічных канонах, абапіраючыся на "санатную форму" і развіваючыся прыблізна па тых самых законах, што і падзеі ў жыцці альбо сюжэты літаратурных твораў. У выніку з геніяльных мелодый атрымліваліся геніяльныя творы, а з трывіяльных мелодый — хоць і фонавая, але ўсё ж жывая музыка.

У адрозненне ад санат і сімфоній, сучасная песня доўжыцца 3 — 5 хвілін. Яе простая музычная форма не прадугледжвае развіццё, якое будзе завабліваць слухача нібы цікавая гісторыя. Куплет-прыпеў, куплет-прыпеў, сола (ці мост) і два прыпевы… І каб усё ж прыцягваць увагу, стваральнікі поп-музыкі напампоўваюць яркасцю асобныя дэталі песні. Але чым больш актыўна выкарыстоўваюцца такія спосабы, тым больш яны ператвараюцца ў шаблон. І ў выніку гэта музыка ўяўляе ўсё меншую каштоўнасць.

Выйсцем з дадзенай сітуацыі мне ўяўляецца стварэнне музыкі па сюжэце. Што гэта значыць і як яе ствараць? Вось адзін з падыходаў. Возьмем з жыцця ці з твора мастацтва нейкую гісторыю, возьмем сваю мелодыю і будзем рабіць аранжыраванне, абапіраючыся на гэты сюжэт. Можна таксама ўявіць сабе нямое кіно на гэты сюжэт і як быццам агучваць сваёй музыкай такую стужку. Развіваць музычную тэму па сюжэце нашмат лягчэй, чым спадзявацца толькі на адну інтуіцыю. Між іншым, такі падыход я ўжо выкарыстоўваю, запісваючы вакалістаў. Калі папрасіць іх заспяваць так, каб сам голас як быццам распавядаў гісторыю, слухача гэтае кранае.

Спадзяюся, цяперашні дэграданцкі канон "бум-бум" некалі будзе парушаны. Мая мара, каб у Беларусі дамінавала новая музычная плынь — станоўчая музыка. Прычым станоўчы — гэта не проста "пазітыўны". Станоўчы — гэта той, хто яшчэ і кіруе працэсам станаўлення! Я мару, каб нашу музыку пазнавалі па незвычайнай сюжэтнай цікавасці аранжыроўкі, па кранальнасці спеваў. Але каб стаць папулярнай, сюжэтная музыка павінна мець зразумелую, зручную для творцаў форму. Над гэтым цяпер і працую!

Занатавала Ганна ЛУТАВА

Меркаванні калумністаў і экспертаў газеты не абавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.

Тактыка культурнага развіцця

Мастацтва атрымання грантаў

Культура Дрыбіншчыны — бадай, адна з брэндавых у краіне. Прынамсі, менавіта яна асацыюецца са старадаўнім мясцовым майстэрствам шапавальства, якое не згубіла тут практычнага прызначэння. Магічнасць "цёплага" брэнду асабліва актуальная ў сённяшнія дваццаціградусныя маразы. Але зусім не таму рэгіянальны фестываль народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў "Дрыбінскія таржкі" атрымае фінансавую падтрымку Еўрасаюза.

Яўген РАГІН

Проста з грантамі трэба ўмець працаваць. У аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага райвыканкама такім выключна патрэбным на сёння мастацтвам авалодалі яшчэ чатыры гады таму. Начальнік названага аддзела Алена Рабкавец распавядае, што першыя еўрасаюзаўскія грошы пайшлі тады на стварэнне ў мясцовым гісторыка-этнаграфічным музеі творчай лабараторыі па даследаванні і выкарыстанні нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Сродкі былі выкарыстаны для набыцця камп'ютарнай тэхнікі, відэаабсталявання ды касцюмаў для тэатралізацыі.

Чарговаму "ўліванню" замежных грошай паспрыяла грамадскае аб'яднанне "Адпачынак у вёсцы". Шапавальства Дрыбіншчыны стала дзейсным стымулам для развіцця ў раёне сельскага турызму. Мы пісалі пра тое, як еўрасаюзаўскія грошы былі выкарыстаны для набыцця мэблі і для раённага музея, і для майстэрні, дзе працуюць гурткі шапавальства. Сродкі пайшлі і на набыццё сыравіны, у прыватнасці — каляровай воўны, ды сучаснага шапавальскага абсталявання, якое дазволіла майстрам не абмяжоўвацца вырабам традыцыйных валёнак, а выйсці на якасна новы ўзровень падрыхтоўкі з лямцу мастацкіх кампазіцый, адмысловай біжутэрыі…

І вось апошняя навіна. Культура Дрыбіншчыны выйграла конкурс мясцовых ініцыятыў у межах праекта "Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь". Як вядома, праект рэалізоўваецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН) пры фінансавай падтрымцы Еўрасаюза. Такім чынам "Дрыбінскія таржкі" прызнаны адным з рэсурсаў устойлівага развіцця раёна.

Некалькі слоў пра фестываль, які ладзіцца штогод. Гэта маштабная дзея працуе на папулярызацыю і развіццё мясцовага традыцыйнага народнага мастацтва, якое цяпер шырока вядомае і за межамі Беларусі. Летась, да прыкладу, у рабоце "Дрыбінскіх таржкоў" бралі ўдзел прадстаўнікі Украіны, Малдовы і Кітая. Сёлета, па словах Алены Рабкавец, геаграфія фэсту будзе пашырана.

А на ўмацаванне яго матэрыяльна-тэхнічнай базы, сцвярджае начальнік аддзела, ПРААН выдаткоўвае 18 тысяч долараў. Іх выкарыстанне будзе распачата з лютага. Мяркуецца набыць мультымедыйнае абсталяванне, відэаапаратуру, светлавыя прыборы і сцэнічныя касцюмы. Апрача гандлю сувенірамі пройдуць чатыры семінары, а таксама шэраг майстар-класаў па развіцці народных промыслаў, рамёстваў і традыцыйнага мастацтва, да прыкладу, побытавых танцаў Беларусі. У семінарах і майстар-класах прымуць удзел вядучыя спецыялісты вобласці і рэспублікі.

Апрача небюджэтных "Дрыбінскія таржкі" напоўніцу выкарыстоўваюць і спонсарскія грошы. Паколькі лепшага піяру для "шапавальскай сталіцы" і не прыдумаць, дык у брэндавым фэсце прымаюць удзел і ўсе сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якія на дзень святога прарока Ільі не толькі прапаноўваюць спажыўцу здабыткі новага ўраджаю, але і выступаюць фундатарамі шматлікіх фестывальных крамніц. Такім чынам, брэнд, адроджаны мясцовай культурай, актыўна працуе цяпер на агульную карысць.

К

Кнігі — паступленні ў фонды Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея.


Уладзімір Мурахвер. "Керсці Вакс, мастак".


Людміла Валковіч-Борыс. "А на Купалу сонца рана іграе".

Што новага ў абласных

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Сярод буйных закупак-2015 можна адзначыць калекцыю мінералаў Уладзіміра Янушава, частку якой перадаў яго ўнук Ігар Аляксандравіч. Але самыя каштоўныя адзінкі са збору музей набыў. На гэтую ж суму брэстчане прыдбалі прадметы побыту: тэлефон 1930-х, этнаграфічныя рэчы, паштоўкі 1940 — 1960-х. Да слова, у 2014 годзе на тыя ж 25 мільёнаў Брэсцкі абласны краязнаўчы музей набыў трыпціх Настассі Фяцісавай і яшчэ некаторыя рэчы.

Вазы, карты, старадрукі…

Кожны год Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей набывае творы сучасных мастакоў. Канкрэтна летась фонды папоўніліся карцінамі, графікай, творамі ДПМ 45 майстроў. У калекцыі цяпер ці не ўсе карціны мастака Уладзіміра Мурахвера. У 2015-м музей набыў дэкаратыўныя вазы і скульптуры шклозавода "Неман", ігральныя карты 1940-х (былой гродзенскай друкарні Лапіных). У фондзе старадрукаў і рэдкіх кніг зараз знаходзяцца нямецкія і французскія старадрукі пачатку XIX стагоддзя. У 2015 годзе бюджэтных сродкаў на закупкі было выдаткавана 152 мільёны, пазабюджэтных — 16 мільёнаў (у 2014-м — 308 мільёнаў з бюджэту і 4 з пазабюджэту).

"Антураж часу"і яго кошт: ад кручка з мінулай эры да "Успамінаў…" Эміля Лазэ

Жэоды аметыста, атрыманыя з Брэсцкай таможні.

Кручок рыбалоўны і ўспаміны 1927-га

Вясной Гомельскі палацава-паркавы ансамбль правёў акцыю "Даеш экспанат у музей!". Гэтак фонды музея папоўніліся рэчамі 1960-х, сярод якіх — мэбля, адзенне, тэхнічныя прыстасаванні… Музей набыў прадметы археалогіі (дзейнічае і выставачны праект "Новае ў археалогіі Гомельшчыны") — кручок рыбалоўны (II тысячагоддзе да нашай эры), шпільку з колцападобным навершам мілаградскай культуры (VII — III стагоддзі да н. э.), пласціністы пярсцёнак з бронзавай схематычнай выявай, як мяркуецца, святога Георгія XII — XIII стагоддзяў.

Нядаўна ў музеі з'явілася акварэль нямецкага мастака Эміля Лазэ — "Успаміны пра гомельскі парк", якую ён напісаў у 1927 годзе. У 2014 годзе музей набыў памятны медаль "У гонар 50 гадоў выбітных ваенных заслуг генерал-фельдмаршала князя Варшаўскага Паскевіча Эрыванскага", які быў зроблены на Варшаўскім манетным двары. Хутчэй за ўсё, гэты медаль калісьці знаходзіўся ў калекцыі ўладальніка палаца. Сярод новых фондавых паступленняў можна адзначыць гравюру пачатку XIX стагоддзя з партрэтам Пятра Румянцава-Задунайскага, літаграфіраваны партрэт Івана Паскевіча 1855 года.

Осіп Цадкін. Літаграфія.

Якія планы? Музей мяркуе стварыць выставу першых дзесяцігоддзяў пасляваеннага часу, на якой наведвальнікі змогуць убачыць модныя тэндэнцыі другой паловы XX стагоддзя, напрыклад, жаночыя ўпрыгожанні, а таксама розныя рэчы таго часу. У 2016 го-

Стрыт-арт у дапамогу ЖКГ

"Сава-сіпуха". Мінск, вуліца Калініна, 1.

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Апошняя манументальная праца — выява вушастай савы, птушкі 2015 года, на фасадзе Гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, створаная пры падтрымцы грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны". Яшчэ адну птушку, саву-сіпуху, якая з'явілася падчас фестывалю "Vulica Brasil", можна пабачыць на мінскай плошчы Калініна. Таксама летась у рамках мастацкага праекта "Мартовские коты" былі створаны эмацыйныя малюнкі катоў у дварах непадалёк ад парка Горкага.

Часам жыхары дамоў, якія стаміліся чакаць дапамогі ад ЖКГ, па сваёй ініцыятыве запрашаюць нас, каб упрыгожыць тэрыторыю вакол сябе. Так, да прыкладу, было з дзіцячай пляцоўкай у раёне Мінскага трактарнага завода. Але збольшага мы працуем самастойна ці займаемся валанцёрствам. Напрыклад, распісалі сцены на тэрыторыі псіханеўралагічнага дома-інтэрната ды дзіцячага кардыёхірургічнага цэнтра.

Дарэчы, калі працуеш не ў рамках фестывалю ці праекта, узгодненага гарадскімі ўладамі, даводзіцца даведвацца, каму належыць той ці іншы будынак, браць дазвол ад ЖКГ, архітэктара ці таварыства жыхароў. Справа нялёгкая, але магчымая.

Што будзе з працамі?

— Стрыт-арт — незакансерваваны від мастацтва, і можа стацца так, што на наступны дзень працу зафарбуюць, але мастакі не будуць крыўдаваць з гэтай нагоды, бо разумеюць: працавалі для таго, каб хаця б часова наладзіць сувязь з гараджанамі, каб данесці да іх свае думкі. Насамрэч, пасыл ці ідэя ёсць у кожнай нашай працы, але мы лічым за лепшае пакінуць разбірацца ў сэнсах жыхарам Мінска і аматарам таго, чым займаемся. Нас цікавіць удзел менавіта саміх людзей. Зафарбоўваць працу ці пакідаць — гэта таксама іх ініцыятыва. Але ў любым выпадку — ініцыятыва, а не бяздзейнасць. Хай заўтра працы і не будзе, на месцы ранейшай можа паўстаць іншая. Дзеля гэтага руху і існуе стрыт-арт.

Алена МАЧУЛЬСКАЯ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

Уладзімір Тамашэвіч. "На водшыбе".

Леанід Дударэнка. "Нацюрморт з рыбай".

музеях?

Адно з паступленняў у археалагічную калекцыю Гомельскага палацава-паркавага аксамбля.

Бронзавы кельт меларскага тыпу.

Алесь Цыркуноў. "Звінагродскі Б.Ф."

Уладзімір Вішнеўскі. Партрэты гістарычных асоб.

Медаль у гонар І.Ф. Паскевіча.

дзе споўніцца 120 гадоў з дня нараджэння мастака Барыса Звінагродскага, таму калекцыя жывапісу папоўнілася яго партрэтам пэндзля Алеся Цыркунова, напісаным каля 40 гадоў таму.

Літаграфія Осіпа Цадкіна

Віцебскі абласны краязнаўчы музей у 2014 годзе закупіў 19 работ сучасных мастакоў на 100 мільёнаў беларускіх рублёў, якія выдзяліў абласны бюджэт. А летась музей набыў 20 работ трох сучасных мастакоў з горада над Заходняй Дзвіной на суму 25 мільёнаў рублёў (таксама сродкі абласнога бюджэту). У 2015-м у фондзе абласнога краязнаўчага з'явілася і літаграфія Осіпа Цадкіна, кошт якой — 18 мільёнаў. Набыта яна была на пазабюджэтныя сродкі. Таксама фонды папаўняюцца падоранымі рэчамі.

Бронзавы кельт у Магілёве

У Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі імя Еўдакіма Раманава папоўніліся калекцыі "Археалогія" і "Мяккая этнаграфія". Што да першай, то ў ёй ужо знаходзіцца бронзавы кельт меларскага тыпу (I тысячагоддзе — VIII стагоддзе да нашай эры). У Беларусі такую рэч амаль немагчыма знайсці, а ў магілёўскім музеі гэта ўжо другі экзэмпляр, які быў знойдзены на тэрыторыі Падняпроўя (Быхаўскі раён). У калекцыі ж "Мяккая этнаграфія" з'явіліся прадметы жаночага народнага касцюма магілёўскага строю: кашуля і фартух пачатку XX стагоддзя. Серыю партрэтаў (разцовая гравюра) гістарычных персанажаў, звязаных з ваеннымі падзеямі XVII стагоддзя, што закранулі Магілёўшчыну, выканаў Уладзімір Вішнеўскі. Але з пяці работ музей змог набыць тры.

Што да вылучаных грошай, то ў 2014 і 2015 гадах музей закупляў рэчы на суму 70 мільёнаў рублёў штогод. А ў 2013-м — на 395 мільёнаў… У далейшым Магілёўскі абласны музей плануе папоўніць калекцыі "Ваенная гісторыя", "Фотадакументы", "Нумізматыка" ды іншыя.

Вольга РОПАТ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ
Ілюстрацыі да матэрыялу прадастаўлены музеямі.

Тактыка культурнага развіцця

Эксперты па нябачным

Летась убачыла свет краязнаўчая аўдыякніга — вынік працы над праектам "Гродна: пачуць нябачнае". У спецбібліятэцы для інвалідаў па зроку і тых, хто слаба бачыць, прайшла прэзентацыя новага выдання. Але дарога да заключнага мерапрыемства ў бібліятэкараў Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Гродна была няпростай.

Яшчэ год таму ў фондзе спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку і тых, хто слаба бачыць, кнігі пра Гродна займалі сваё месца толькі ў традыцыйным друкаваным выглядзе. На ўліку ж у Гродзенскім абласным аддзяленні грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў па зроку" амаль 500 асоб, а інвалідаў па зроку і тых, хто слаба бачыць, пражывае ў горадзе значна больш. Аўдыякніга — унікальны шанец спазнання імі гісторыі прыгожага еўрапейскага горада, крок да роўных магчымасцяў. Рэалізацыяй праекта ад ідэі да практычнага ажыццяўлення і прэзентацыі займаліся неабыякавыя людзі: бібліятэкар спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку Раіса Ланеўская, бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Таццяна Шыбут…

Былі агучаны папулярныя краязнаўчыя кнігі. Дапамагло ААТ "Гродзенскі мясакамбінат". Асаблівую атмасферу таямнічасці і прыгажосці гістарычнага мінулага Гродна стварыў дыктар, акцёр і рэжысёр Віктар Мароз, чый голас будзе суправаджаць слухача на працягу 13 гадзін гучання аўдыякнігі. Спецыяльна для аўдыякнігі Ірына Жыбіна напісала лірычную песню пра Гродна "Вальс лёсу". На аўдыядыску песня гучыць у выкананні дуэта Ірыны Жыбінай і Аляксандра Багданава, актыўных карыстальнікаў спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку. У выніку рэалізацыі праекта 50 аўдыякніг "Гродна: пачуць нябачнае" трапілі ў фонды спецыяльных бібліятэк краіны, у школы-інтэрнаты для дзяцей, якія слаба бачаць, у рукі аматараў гісторыі горада.

У красавіку пачалася распрацоўка новага праекта па стварэнні тактыльных кніг для невідушчых дзяцей "Цёплыя кнігі". Узяліся за такі праект бібліятэкары невыпадкова. Больш за 10 гадоў філіял № 5 Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Гродна працуе з вучнямі Гродзенскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. Штогадова бібліятэку наведваюць больш за 40 выхаванцаў школы-інтэрната. Для іх праводзяцца літаратурныя гульні і віктарыны, ладзяцца чытанні. У сваёй працы аўтары праекту абапіраліся на фінскі дзесяцігадовы вопыт па вырабе тактыльных кніг для дзяцей. Унікальнасць праекта ў тым, што падобных кніг да гэтага часу не было ні ў публічных, ні ў школьных бібліятэках не толькі Гродна, але і многіх іншых гарадоў краіны. Фінансавую падтрымку аказала ААТ "Малочны мір".

Праект прадугледжвае стварэнне чатырох тактыльных кніг. Першыя дзве былі зроблены рукамі ўдзельніц клуба "Радасць", які аб'яднаў у філіяле № 10 майстрых-рукадзельніц пад кіраўніцтвам бібліятэкара Ларысы Аутка. У кнігах па чатыры старонкі з рэльефнымі малюнкамі да вядомых вершаў дзіцячых паэтаў. Друкаваны тэкст прадубляваны шрыфтам Брайля. Аналагічна зроблена трэцяя кніга па казцы "Шчанюк", у якой ужо сем ярка ілюстраваных старонак. Выкарыстоўваліся мех, воўна, лямец, скура, тасьма, гузікі і многія іншыя матэрыялы.

У якасці "экспертаў" выступілі чытачы спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку і навучэнцы школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. Па іх прызнанні, не ўсе дэталі былі пазнавальнымі, але кнігі навобмацак далі адчуванне цеплыні, новыя ўражанні. Заўвагі "экспертаў" аўтары праекта пастараліся ўлічыць. Да працы як валанцёры былі прыцягнуты студэнты педагагічнага факультэта Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Завяршаецца выраб чацвёртай кнігі па рускай народнай казцы "Калабок".

Наталля НАЗЕМЦАВА,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Гродна

Шлях мастацтва з вуліцы стаў… раўнейшым?

З праекта "Мартовские коты". Мінск, у дварах па вуліцы Румянцава (насупраць МГЛУ).

"Гусляр". Мінск, вуліца Кастрычніцкая.

Бамонд: опера, балет

Форум + конкурс: які іх плён?

Мінскія міжнародныя Калядныя і "многа-многа радасцяў"

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі завяршыў год, паводле традыцыі, звязкай дзвюх грандыёзных падзей пад грыфам "Мінскі міжнародны Калядны" — конкурсам вакалістаў, які прайшоў у другі раз, і оперным форумам, шостым па ліку.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Амаль два тыдні, з 9 па 20 снежня, тэатр гасцінна прымаў гасцей. Адных толькі канкурсантаў было 168 з 18-ці краін (заявак, дарэчы, паступіла каля 270-ці, але, як звычайна, хтосьці захваруў, змяніў планы, адмовіўся — адным словам, не прыехаў). На закрыцці форуму пераможцы з'язджаліся з зоркамі ў агульным гала-канцэрце.

Нарадзіўся фармат?

Як у вядомай навагодняй песеньцы, конкурс і форум, сустрэўшыся пад каляднай ёлачкай, прынеслі ўсім нам "многа-многа радасці". І, як у калядных псалмах, сімвалізавалі нараджэнне — у дадзеным выпадку, новых зорак. Новага фармату нашага фестывалю. Новых прыхільнікаў беларускага опернага мастацтва.

Можна радавацца, што ў жорсткім спаборніцтве (да фіналу дапусцілі толькі 10 спевакоў) саліст нашага Вялікага тэатра Віктар Мендзялеў атрымаў Другую прэмію і спецыяльны прыз — запрашэнне выступіць у Манрэалі (Канада). Што адзін з вечароў форуму — тэатралізаваны канцэрт "Італьянская жарсць" — быў цалкам прысвечаны беларускай творчай моладзі, з'яднаўшы квартэт маладых спевакоў, маладых дырыжора і рэжысёра (2015-ы — Год моладзі!). Што запрошаныя замежныя крытыкі не сквапіліся на ўхваленні. Што залы былі паўнюткімі, апладысменты — бурнымі, захапленне публікі — поўным, задавальненне — глыбокім, рэзананс — вялікім…

Памятаю, як на першым такім форуме, сабраўшы разам замежных і беларускіх крытыкаў, кіраўніцтва тэатра зацікаўлена распытвала, па якім шляху развівацца нованароджанаму фестывалю надалей. І ўсе ў адзін голас сцвярджалі, што больш перспектыўным з'яўляецца запрашэнне не асобных салістаў, а адметных спектакляў (у тым ліку камерных, эксперыментальных) з розных краін. На першым форуме мы сапраўды ўбачылі латвійскую "Травіяту" і маскоўскага "… Цырульніка" (у версіі Новай Оперы імя Яўгена Колабава). На другім — запрошаны спектакль быў толькі адзін: зноў "Травіята", але маскоўская, Музычнага тэатра імя Станіслаўскага. На трэцім — зноў адзін, затое ўпершыню на нашай сцэне: "Зігфрыд" Вагнера ў сафійскай пастаноўцы. На чацвёртым форуме да пецярбургскага "Балю-маскараду", даволі сярэдняга па ўзроўні (Міхайлаўскі тэатр), упершыню далучыліся камерныя аднаактоўкі — усе беларускія, але адразу шэсць! Летась, калі ў рамках форуму прайшоў уласны конкурс (памятнае многім спаборніцтва 2012 года "Competizione dell'Opera" ладзілася замежнымі арганізатарамі і натхніла наш тэатр), беларускіх аднаактовак было дзве. Сёлета — не засталося ніводнай, як і запрошаных спектакляў.

Хочацца верыць, што прычынай таму толькі грошы. Бо нарадзіўся новы фармат форуму — з разлікам адно на оперныя галасы. Інакш чаму быў запрошаны цалкам увесь склад салістаў Вялікага тэатра Расіі, занятых у "…Анегіне" з рэжысурай Дзмітрыя Чарнякова, але спявалі яны ў нашым да болю традыцыйным спектаклі. Між тым, уся сцэнаграфія адметнай маскоўскай пастаноўкі — вялізны стол і сцены пакоя. Крэслы можна было назбіраць і нашы, хор наш, мяркую, таксама не адмовіўся б паспяваць "за сталом". Але… абышлося без рэжысёрскай альтэрнатывы.

Апошняе тым больш крыўдна, што і на конкурсе, і на форуме добра заявілі пра сябе маладыя беларускія рэжысёры. У трэцім туры канкурсанты павінны былі выканаць сцэну з оперы, якая ідзе ў нашым тэатры. Дар'я Пататурка і Наталля Бараноўская прапанавалі сваё бачанне, сыходзячы з акцёрскіх здольнасцей удзельнікаў, выкарыстоўваючы відэашэраг (камп'ютарная графіка — Марыя Панджавідзэ) і тое, што ў тэатры называецца сцэнаграфіяй "на падборы песенных хітоў (дырыжор — Іван Касцяхін), дзе той жа Ілья Сільчукоў бліскуча выступіў ва не ўласцівым яму раней камічным амплуа. Але прозвішча рэжысёра Алены Медзяковай, якая і раней спрабавала стварацъ, прычым даволі ўдала, тэатралізаваныя праграмы, не патрапіла ў фестывальны буклет.

Лепшым дырыжорскім здабыткам форуму (і сапраўдным "адкрыццём нанова") сталася майстэрства нашага Вячаслава Воліча, якое значна ўзрасло пасля працяглай працы ў Маскве.

Конкурс

Арганізацыя сёлетняга спаборніцтва не змянілася. Першы тур застаўся выпрабаваннем для… нашых канцэртмайстраў і членаў міжнароднага журы. Удзельнікі спявалі ўсяго па адной арыі, але нават па першых нотах было зразумела, што некаторыя вакалісты, як гэта назіралася і летась, маюць не адпаведны міжнароднаму опернаму конкурсу ўзровень. Затое на канцэртмайстраў прыпадала па дваццаць (!) удзельнікаў, у кожнага з якіх яны ўкладвалі свае сілы, імкнуліся дапамагчы… Дый для журы пры такім "напливе" і далейшым выбываННі больш як 4/5 канкурсантаў пазбегнуць складанасцей было немагчыма.

Конкурс паказаў, што ёсць галасы добрыя, ёсць вельмі добрыя і папраўдзе шыкоўныя. А тых спевакоў, якіх будзеш з задавальненнем слухаць і, што для оперы немалаважна, глядзець, чыім героям будзеш суперажываць, — не стае. Сыходзячы менавіта з оперных, тэатральных, а не адно канцэртных патрабаванняў, неаспрэчнага Гран-пры на конкурсе, на маю думку, не было. Так, сапраўдным адкрыццём стала Надзея Паўлава з Пярмі, якая той Гран-пры атрымала, прычым разам з прызам глядацкіх сімпатый (той жа прыз з ёй падзяліў уладальнік Першай прэміі Міхаіл Малафій з Украіны). Але пры ўсёй музычнасці спявачкі, неверагоднай вакальнай выразнасці, прыгажосці яе сапрана, уменні выдаваць кранальныя (і чутныя па ўсёй зале!) ціхія гучанні ў высокім рэгістры, якога многія дасягаюць звычайным крыкам, ёй яшчэ трэба вельмі і вельмі многа працаваць над відовішчным "малюнкам" сваіх партый. Ці ж можа Віялета ў "Травіяце" кожны крок "убіваць" у падлогу? У спявачкі можа быць бліскучая будучыня сусветных маштабаў — трэба толькі знайсці рэжысёра, які будзе карпатліва працаваць над пластыкай.

Здзіўленне ў многіх выклікала Другая прэмія нашага Віктара Мендзелева (нагадаю, летась ён таксама ўдзельнічаў у гэтым конкурсе, але дайшоў толькі да другога тура). На маю ж думку, журы выказала пашану не адно да тэатра-гаспадара, але і ніколькі не пацьмянёўшы побач з цудоўнай Марфай — Венерай Гімадзіевай (Расія): яны былі насамрэч годнымі адно аднаго партнёрамі.

Форум

Замест паўнавартасных рэцэнзій на кожны спектакль і канцэрт форуму (гэта з поспехам зробяць і ўжо зрабілі запрошаныя замежныя крытыкі, убачыўшы нашы нядаўнія прэм'еры ўпершыню) сканцэнтруем увагу на фестывальных тэндэнцыях.

Калі б конкурсны падыход распаўсюджваўся і на самі спектаклі, дык лідзіравала б згаданая "Царская нявеста". Аднак пры ўсіх яе неаспрэчных плюсах і ў рэжысуры (Міхаіл Панджавідзэ), і ў выкананні (чаго каштуе той жа Станіслаў Трыфанаў, які ўзнёс партыю Гразнога на вяршыні нават не драматызму, а сапраўднага трагізму) з агульнай палітры сцэнічнай натуральнасці выбіваўся крыху шаржаваны вобраз Дуняшы (Марына Мароз). Пэўна, пазначыць яе кантраст з Марфай можна было не адкрыта плакатнымі, а больш тонкімі сродкамі.

У "Яўгеніі Анегіне", пры ўсіх хібах маральна застарэлага сцэнічнага відовішча, цікава было назіраць за самімі салістамі — скрозь запрошанымі. Яны сумленна прытрымліваліся нашых мізансцэн, але ўдзел у маскоўскім спектаклі Дзмітрыя Чарнякова "чытаўся" ўжо ў іх вакале, а менавіта ў яго асэнсаванасці, інтанацыйнай выразнасці як уласна музычных фраз, так і іх славеснага напаўнення. Праз дакладна пастаўленыя сэнсавыя акцэнты адразу "палепшала" дыкцыя, з'явілася лагічнае апраўданне кожнага з учынкаў. У фінале Тацяна не "наступала на горла" сваёй колішняй закаханасці ў Анегіна, не прыносіла нікому не патрэбную "ахвяру". Пастаралеўшы-памудрэўшы, яна абірала стабільнасць (дый як не пакахаць такога Грэміна, якога ўвасобіў бас-барытон Алег Цыбулька!), а не жыццё на непрадказальным вулкане: пачуццяў, жаданняў, прыхамацяў з боку Яўгена і абавязкаў — з яе. Па твары артысткі было бачна, што канчаткове рашэнне гераіня прымала акурат у той момант, калі ў Анегіна вырывалася: "Ты для меня должна…"

У "Кармэн", наадварот, кахання не было зусім. Паміж галоўнай гераіняй (народная артыстка Украіны Анжэліна Швачка) і Хазэ (Эдуард Мартынюк) цягам усяго спектакля панавала не каханне, а негалоснае спаборніцтва ў духоўным лідарстве. Ураўняць іх магла толькі смерць. Але для разумення гэтага хапіла б і фрагмента, а не ўсяго спектакля, сумную "зададзенасць" якога не столькі парушалі, колькі "падрывалі знутры" каларытныя постаці астатніх салістаў (той жа ансамбль кантрабандыстаў аказаўся на дзіва "персаніфікаваным", нават знешне) і найперш — тарэадора Эскамільё (Уладзімір Пятроў).

Пры ўсёй зорнасці гала-канцэрта больш за тры гадзіны — гэта занадта. Аркестр на такім закрыцці форуму ўпершыню быў у яме, а не запаўняў сабой сцэну. Салісты выглядалі на ёй сіратліва, асабліва ў другім аддзяленні, калі зніклі нават "архітэктурныя выявы" на экране. Узгадалася нядаўняя тэлетрансляцыя гала-канцэрта "Гелікон-Оперы" з Масквы, у якім было багата адмыслова падрыхтаваных тэатралізаваных нумароў. Так што ў "конкурсе канцэртаў" адназначна перамагла кампактная вышэйапісаная "Італьянская жарсць". Але што трэба абавязкова падтрымліваць і надалей, дык гэта добра выяўлены ў абедзвюх праграмах разлік на пераможцаў мінскіх калядных конкурсаў: вось ён, плён цяперашняга сумяшчэння вакальнага спаборніцтва і опернага форуму.

Фота прадастаўлены тэатрам

Удзельнікі Гала-канцэрта форуму.

Надзея Паўлава (Гран-пры) і Міхаіл Малафій (Першая прэмія).

Марыя Шабуня і Юрый Гарадзецкі ў "Італьянскай жарсці".

Мастыхін

Імправізацыя і яе коды

Абстракцыя — гэта...

У выставачнай зале Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Клеафаса Агінскага працуе выстава "Імправізацыя". Гэтай экспазіцыяй абстрактнага мастацтва стваральнікі хацелі завяршыць серыю штогадовых выстаў прафесійных творцаў Маладзечна: Мікалая Аўчыннікава, Рыгора Мяжуева, Уладзіміра Тамашэвіча, Аляксандра Пашкевіча, а таксама маладых талентаў Дзмітрыя Сакалоўскага і Наталлі Чарвонцавай.

Уладзімір Тамашэвіч. "Кампазіцыя".

Аляксандр Пашкевіч. "Узлёт".

Мікалай Аўчыннікаў. "Тайна квазара № 2".

Яны розныя, гэтак жа, як і іх творчасць, але ідуць яны шляхам не аднаўлення на палотнах і аркушах рэальнасці, а стварэння ўласнай творчасці, перадаючы адчуванні, эмоцыі, сутнасць матэрыяльнага свету пластычнай мовай формы і колеру. "Імправізацыя" — гэта плён інтуіцыі, рэакцыя мастака на навакольны свет. Дарэчы, адсюль і назва выставы. Творцы хацелі паказаць нам свет з іншага боку і, прынамсі, прапанаваць гледачу ўбачыць свет праз беспрадметнае мастацтва. Абстрактны жывапіс падобны музыцы, дзе колеры гучаць акордамі, ствараючы мінорны або мажорны настрой. Іх спалучэнне прымушае нас адчуць то напружанасць і экспрэсіўнасць, то змрочнасць, то прымірэнне.

Абстракцыя — гэта спосаб перадачы творцам самых моцных перажыванняў мінулага, душэўных эмоцый, калі слоў недастаткова, а ўбачанае хочацца захаваць ды падзяліцца ім з іншымі. Мастак выбірае найбольш сугучныя яму ў дадзены момант формы і фарбы, спалучаючы або падзяляючы іх у пошуку ўнутранага гучання.

У свет абстракцыі ўвайсці няпроста, мае быць пэўны настрой, уменне чуць музыку прасторы, адчуваць патрэбнасць вызвалення ад матэрыяльных вобразаў. Але куды больш складана з гэтага свету выйсці: такой прыцягальнай сілай ён валодае. Гэта было заўважна па наведвальніках выставы, якія горача абмяркоўвалі карціны Рыгора Мяжуева з яго орбамі: як нечакана ўзніклі бурбалкі надзеі, якія лопаюцца на сетцы свядомасці, што стварае ілюзію патоку ўражанняў, заснаваных на нашых эмоцыях. Таксама ўражваюць работы Уладзіміра Тамашэвіча, дзе на мяжы жывапісу і графікі знаходзіцца тэхніка акварэлі і гуашы. Выбар колеру мастаком не выпадковы: ён становіцца ўвасабленнем духоўнага працэсу, энергетычнага пасылу творцы. У карцінах Мікаля Аўчыннікава мастак як бы зашыфроўваў сваё мінулае перажыванне, прапускаючы яго праз цяперашняе бачанне, і дасылае далей у будучыню. Перад працамі Аляксандра Пашкевіча стаіш, як перад вітражамі абстракцыі, і з кожным новым поглядам раскрываецца нязведанае зерне сэнсу, да гэтага часу схаванае ў ценю.

Жывапіс і графіка на выставе маюць аднолькавы код, разуменне якога і будзе тым, чаго мастак чакае ад свайго ідэальнага гледача: працэсам судакранання іх часцінак свядомасці.

Экспазіцыя перадае атмасферу сучаснага мастацтва, дорыць гледачу сваё значэнне і сваю магчымую інтэрпрэтацыю. А яшчэ — бязмернае шчасце здагадкі, калі ты раптам спадзяешся, што зразумеў напісанае мастаком. Але ці хацеў ён наогул нешта сказаць? А мо проста атрымліваў асалоду ад працы? Ты пастаянна адчуваеш сябе падманутым, але не на побытавым узроўні, а на нейкім іншым, тым, дзе ўсё магчыма і па сутнасці не страшна і памыліцца.

Алена СКАБЛО, мастацтвазнаўца

Варыяцыі часу магнатаў

Як звярнуцца да нашай гісторыі небанальным чынам і зрабіць твор мастацтва па такой тэматыцы цікавым, сучасным і зразумелым? Ці такая простая яна для трактоўкі? Удзельнікі выставы "Час магнатаў" у Гімназіі-каледжы мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка прапанавалі свае інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі XV — XVIII стагоддзяў і паказалі гэта ў жывапісе, графіцы, скульптуры.

Сярод удзельнікаў выставы, зладжанай у рамках конкурсу культурных ініцыятыў праекта "Голас культуры" пры падтрымцы Еўрасаюза, — выкладчыкі гімназіі-каледжа, студэнты ВНУ ды навучэнцы. Іх з'яднала гісторыя, пошук вобразу пэўнага перыяду мінуўшчыны — "часу магнатаў", імкненне "прапусціць" яго праз сябе і данесці ўласнае далікатна-мастацкае ўспрыманне да гледачоў, з'яднаць легенды, герояў, помнікі пэўнай эпохі ў новым мастацкім кантэксце. Вось і на адкрыцці выставы скульптар Іван Арцімовіч — адзін з арганізатараў праекта і яго ўдзельнік — дапамог гасцям адчуць гісторыю, ажывіўшы традыцыйную батлейку, якую зрабілі вучні 7 класа згаданай навучальнай установы пад кіраўніцтвам мастачкі Алены Піскун-Юр'евай. (А Іван больш за дзесяць гадоў вывучаў майстэрства батлеечнікаў.)

Да архітэктурных помнікаў звярнуўся выкладчык жывапісу і кампазіцыі Піліп Басалыга. Ад ягонай карціны "Мірскі замак" вее спакоем. Тры часткі статычнай работы ўтвараюць неба, зямлю і ваду, і тут ёсць незвычайнае пачуццё суладдзя і гармоніі. Камянецкую вежу на выставе "Час магнатаў" можна ўбачыць у трох мінімалістычных варыянтах вучняў 5 класа гімназіі-каледжа Ягора Давыдзенкі, Мікіты Кулікова ды Эвеліны Безручонак. У гэтых версіях помнікі дойлідства робяцца фонам для ілюстравання гістарычных падзей, легенд і падманяў.

Іван Арцімовіч. "Станіслаў Кішка. Сармацкі партрэт".

Васіль Цімашоў, Паліна Пірагова. "Драўляны дыямент".

Драўляны дыямент, упэўнены метал і ажурная карона

Батлейка, зробленая сямігадовымі гімназіі-каледжа.

Сапраўды, матэрыял уплывае на вобраз персанажа і на яго ўспрыманне. Калі парцаляна або мармур падаюцца больш мяккімі (на маю думку, прыдатнымі для тэм кахання, вечнасці), а дрэва — "цёплы" матэрыял (ідэальны, падаецца, для адлюстравання багатых беларускіх традыцый), то метал стварае вобраз магутнага, упэўненага, нават жорсткага чалавека.

Барбару Радзівіл ажывіла вучаніца 9 класа Дар'я Васілеўская. На маю думку, акурат гэтая скульптура на выставе найбольш дынамічная і адухоўленая. Дар'я перадала не толькі "прывідны вобраз", звыклы па многіх мастацкіх увасабленнях, але і рух гераіні. Пышныя складкі сукенкі Барбары быццам разлятаюцца ў паветры. У адной руцэ княгіня трымае падсвечнік. Часам здаецца, што павевы ветру вось-вось патушаць агеньчыкі. А калі пабачыла работы вучаніцы 8 класа Ганны Хацько, то адразу згадала творчасць англічаніна Обры Бёрдслея: сваю чорную панну Нясвіжа Ганна вырашыла выканаць менавіта ў манеры стылю мадэрн.

Асабліва мяне ўразіла карціна выкладчыка жывапісу, малюнку і кампазіцыі Вольгі Гардзіёнак-Кірэевай "Майстэрня". Жывапіснае палатно — здаецца, вітражнае. Зліліся са святлом, бляскам памяшкання і персанажы Надзеі Макарэй (8-ы клас). Дзяўчына ўбачыла "залаты" час святочным, яскравым, бесклапотным. Героі работы "Баль" расталі ў гэтых зачараваных святле ды мелодыі, і немагчыма разглядзець твары, аздобу адзення. А мо і не трэба? Надзея паказала той чароўна-загадкавы свет, якога так не стае ў нашым жыцці.

Вы калі-небудзь бачылі драўляны дыямент? Гэтым разам Васіль Цімашоў і Паліна Пірагова, вядомыя ў Мінску як аўтары арыгінальных скульптур, што сталі заўважнымі ў гарадской прасторы, вырашылі зрабіць са старых дошак вялікі алмаз, які сімвалізуе багацце. "Фішка" твора ў тым, што кожная грань выканана з уключэннем беларускай арнаментальнай сімволікі.

А як можна ўвасобіць заклік? З якім вобразам ён асацыюецца? У Паліны Шалкоўскай — гэта кінжал у руцэ. Невялікая скульптура — прыклад таго, як можна выявіць падзею, сюжэт літаральна адным вобразам.

Усе звяртаюць увагу на прычэпленыя да столі аб'екты. Так, "Карона часу" Настассі Канашэвіч зроблена з белых свечак і абазначае ўладу магнатаў (прынамсі, так уласны твор інтэрпрэтуе аўтар). Таксама карона для Настассі — яшчэ і сімвал таемнасці ды экспрэсіі, бо агонь — найбольш эмацыйная стыхія. Хрысціна Макаранка прадставіла карону з ільду (дакладней, з матэрыялу, які нагадвае далікатны лёд: маўляў, карона растане і… ад яе застануцца ўспаміны). Ілья Лаўніковіч зрабіў "Карону ўлады". Яна — мінімалістычная, выканана з крыжоў, бо ўлада, на думку маладога творцы, — смерць для каралёў, паколькі можа забіць у асобе дабрыню, шчырасць, любоў… Медная ж карона Валеры Бірала абазначае рамантычны настрой, грацыёзнасць і прыгажосць паненак: пра тое сведчыць ажурнасць твору.

Вольга РОПАТ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

Экспрэс-тур з V.I.P.-земляком

У Мазыры нас прымалі як родных — і прадстаўнікі выканаўчай улады, і тых устаноў культуры, якія мы пазначылі для наведвання. Апекавалі, але вельмі ненавязліва, размаўлялі, не прыхоўваючы цяжкасцяў, і літаральна "заразілі" (прынамсі, мяне) сваёй любоўю да горада. А Міколу Козенку, які нарадзіўся ў вёсцы Целяпуны, што прылягае непасрэдна да Мазыра, і "заражаць" не патрабавалася: усё тут яму знаёмае, улюбёнае. Менавіта з вядомым этнахарэографам, этнахарэолагам, рэжысёрам, прадзюсарам, выкладчыкам кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, навуковым і мастацкім кіраўніком Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня", які праходзіць у гарадскім пасёлку Акцябрскі на Гомельшчыне, я і выправіўся ў камандзіроўку.

Алег КЛІМАЎ, Мінск — Мазыр — Мінск / Фота аўтара

Мазырскі замак.

Перш чым патрабаваць

Мазырскія хронікі з Міколам Козенкам

На кантролі

У краязнаўчы музей Мікола Козенка заўжды хадзіў з задавальненнем ці то з аднакласнікамі, ці то з сябрамі дзяцінства. Улюбёным быў аддзел, прысвечаны ваеннай тэматыцы. Падабалася і разглядаць здымкі старога Мазыра — таго, што назаўжды знік у мінулым. Пазней паўстала цікавасць да прадметаў, якія нясуць этнічны дух: строі, паясы. Сёння ў структуру ўжо Аб'яднанага краязнаўчага музея ўваходзяць, апроч аднайменнай установы, гістарычны цэнтр "Мазырскі замак", Музей народнай культуры Мазыршчыны "Палеская веда", Музей-майстэрня Мікалая Пушкара, Выставачная зала і Музей партызанскай славы ў вёсцы Раманаўка.

Малодшы навуковы супрацоўнік Наталля Салавей правяла для нас экскурсію па "Мазырскім замку", на кампактнай, дагледжанай тэрыторыі якога музей і знаходзіцца. Цяпер тут стала дзейнічаюць тры экспазіцыі (у залах археалогіі, прыроды і баявой славы воінаў-інтэрнацыяналістаў), праходзяць зменныя выставы.

— Нейкіх глабальных праблем у нашай працы няма, — зазначае Наталля Віктараўна. — Але наведвальнікам хацелася б, каб у музеі быў аддзел аб Мазыры часоў Вялікай Айчыннай вайны. З-за браку плошчаў пакуль не можам адвесці яму месца. Да таго ж, ён патрабуе стварэння навуковай і мастацкай канцэпцыі, у рэшце рэшт, — грошай. І ўсё ж пытанне гэтае, мяркую, у найбліжэйшай будучыні вырашыцца станоўча.

Спадарыня Салавей не аднесла да надзённых праблем тое, што галаўному музею і яго філіялам не зашкодзіла б дадатковае памяшканне, у якім захоўваліся б іх фонды. (Прычым так захоўваліся, як мае быць: каб нідзе не працякала, каб нічога не тлела, а моль не тачыла рэчы.) Справа ў тым, што пытанне трымаюць на кантролі. Сярод бягучых клопатаў супрацоўнікаў — утрыманне комплексу ў належным стане: цэнтр размешчаны на ўзгорку, а, значыць, магчымыя апоўзні. Большая частка аб'ектаў — драўляныя, і пад уздзеяннем надвор'я яны непазбежна пакутуюць.

Не ў трэндзе справа

З ранняга дзяцінства наш герой адчуваў цягу і да танцаў, і да музыкі. Мама набыла яму баян, які наш герой пачаў асвойваць спярша "для сябе" ў мазырскай школе-інтэрнаце. (Бацька Міколы Козенкі загінуў, калі сыну споўнілася шэсць, і маці, якая выхоўвала пяцёра дзяцей, вымушана была аддаць хлопчыка ў гэтую ўстанову.) Там ён цягам года атрымліваў першыя навыкі харэаграфічнага мастацтва (таксама парада мамы). Дзесяцігадовым Козенка прыйшоў у Палац культуры "Будаўнік", дзе стаў займацца танцамі ў тамтэйшым ансамблі, а паралельна — баянам у музычнай студыі. У будучыні ён уяўляў сябе ў адной з дзвюх прафесій, але мама мудра палічыла, што захапленні захапленнямі, а жыццёвы шлях трэба выбіраць той, які сапраўды будзе карміць. Ды ўсё ж Мікола не пайшоў у той жа пінскі мяса-малочны тэхнікум, а спыніўся на харэаграфіі...

Пра ПК "Будаўнік" у горадзе кажуць як пра флагман культуры. "Кашу" тут заварваюць народныя калектывы — ансамбль гарманістаў "Мазырскія гармонікі", ансамбль народнай песні "Мазыранка", вакальны ансамбль "Розгалас", вакальны ансамбль эстраднай песні "Медуніца", а таксама ансамбль "Класічныя гітары", пяць рок-гуртоў, клубы раманса, спартыўна-бальнага танца, паэзіі... А "ядуць" тую "кашу", нахвальваючы і просячы дабаўкі, не толькі гараджане. І за межамі Мазыра ведаюць мясцовых творцаў. Яны прадстаўлены на святах агульнадзяржаўных, конкурсах, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях. Адзначаючы ж свой народны ансамбль песні і танца "Паляшучка", дырэктар Палаца культуры Ірына Федчанка заўважае: у маштабах краіны народнае танцавальнае мастацтва прапагандуецца недастаткова.

Супрацоўніцы бібліятэкі Ніна Рагозенка і Ганна Кухарава з Міколам Козенкам.

— Яго трэба нават у нечым навязваць, тлумачыць, што гэта наша, традыцыйнае, спрадвечнае, вечнае, а па радыё і тэлебачанні з раніцы да вечара рэкламуюць папсу, як быццам вечная — яна, — кажа візаві. — І пад такім націскам цяжка растлумачыць моладзі, дзе сапраўднае, а дзе, скажам так, імгненнае. Азірнуцца не паспеем, як народныя танцы апынуцца занесенымі ва ўмоўную "чырвоную кнігу"…

Развіваючы тэму "моладзь і культура", Ірына Аляксееўна прызналася, што некаторыя калектывы "Будаўніка" працягваюць трымацца за кошт тых, каму за 30, і прыток свежых сіл не аказаўся б лішнім. ("Граць на акардэоне ў музычных школах раёна амаль не вучаць", — праінфармавала нас спадарыня Федчанка). А дзе юнакі і дзяўчаты "адрываюцца", дык гэта на дыскатэках у ПК. (Факт адметны ў святле таго, што сёння цікавасць

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Ваўкавышчына /

Па матчыным рэцепце

Важным атрыбутам вясельнай традыцыі на Ваўкавышчыне з'яўляюцца караваі Яўгеніі Прохар, якія вылучаюцца традыцыйнай манерай і памяркоўнасцю аздобы. Больш за 60 гадоў Яўгенія Міхайлаўна выпякае вясельныя караваі па рэцэпце, які яна атрымала ад сваёй матулі Алены Іванаўны Данік.

А вось каравайніцы Валянціна Поўх ды Тамара Карнацэвіч дапаўняюць свае караваі сучаснымі элементамі: рознакаляровымі кветачкамі вялікіх і маленькіх памераў, лебядзямі, якія сімвалізуюць сямейную вернасць. На "паверхах" караваю размяшчаюцца музыкі, сваты, маладыя…

Рэцэптура і тэхналогія прыгатавання быццам падобныя. Аднак кожная з жанчын валодае ўласнымі сакрэтамі, што робяць іх караваі адметнымі і запамінальнымі.

Арэал распаўсюджання элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Комплекс уменняў вырабу традыцыйнага вясельнага каравая на Ваўкавышчыне" ўключае вёскі Майсеевічы, Новая Ятвезь, Мацвееўцы, гарпасёлак Краснасельскі.

Кожная сям'я Ваўкавышчыны імкнецца замовіць караваі ручной работы. Праз тое ён не страціў і сваю сакральную функцыю. Сёння, як і некалі, ён з'яўляецца сімвалам, які "праграмуе" жыццё маладой пары на добры лад. Сімволіка каравая надзвычай багатая: ён — сімвал дабрабыту і багацця, шлюбнага саюзу, даўгалецця і добрай долі.

Наш кар.

Тамара Карнацэвіч і Валянціна Поўх з Ваўкавышчыны.

Бераставіца /

Рыхтуем лаўрэатаў

Навучэнцы класа духавых інструментаў Бераставіцкай дзіцячай школы мастацтваў Віктар Сідаркевіч і Ілья Казлоўскі нядаўна бралі ўдзел ў VIII Міжнародным фестывалі-конкурсе мастацтваў "Санкт-Пецярбургскія калядныя асамблеі". Нашы музыканты з поспехам выступілі адразу ў дзвюх намінацыях: эстрадна-джазавага выканальніцтва і інструментальнага мастацтва. Яны прывезлі на дваіх тры дыпломы лаўрэата першай ступені, адзін — другой.

Іх конкурсная праграма была не па ўзросце складаная. Але вучняў старанна рыхтаваў наш настаўнік Вадзім Антоненка. Ён падабраў менавіта той рэпертуар, які яскрава раскрыў музычныя і выканальніцкія здольнасці хлопцаў. Не менш прафесійным быў акампанемент канцэртмайстра Галіны Архіпавай.

А конкурс досыць прэстыжны. Адзінаццаць гадоў ён праходзіць у межах праекта "Віват-талент" — маштабнай конкурснай праграмы з шырокай палітрай рознажанравых фестываляў. Сёлета ў "…Асамблеях" брала ўдзел больш за 60 калектываў і 350 салістаў і дуэтаў Кітая, Славакіі, Ірландыі, Францыі, Японіі, ЗША… Беларусь была прадстаўлена Мінскам, Брэстам і Вялікай Бераставіцай.

Пераканана, што падрыхтоўка лаўрэатаў міжнародных конкурсаў для любой навучальнай установы — дакладны паказчык эфектыўнасці навучальнага працэсу і прафесіяналізму выкладчыцкага складу.

Ірына БАЕР,
дырэктар Бераставіцкай ДШМ

Навучэнцы Бераставіцкай ДШМ Віктар Сідаркевіч і Ілья Казлоўскі з педагогамі.

Маларытчына /

Зноў у СССР?

На Беларусі шмат музеяў, але прыватных сярод іх — мала. Тым не менш у нашым раёне такі ёсць. Знаходзіцца ён у вёсцы Макраны і створаны на-

Мікола Козенка ўзгадаў былое.

Наталля Салавей.

ад культуры...

да традыцыйных дыскатэк у краіне не тая, "што раньш было".) Стаўленне да моладзі, якая прыходзіць працаваць у сферу, у дырэктара палаца крытычнае: маўляў, вось так зараз навучальныя ўстановы рыхтуюць спецыялістаў?.. І, разам з тым, кіраўнік як бы апраўдвае "змену": "Перш чым нешта патрабаваць ад культуры, ёй трэба даць цалкам канкрэтнае — фінансы"...

Каментуючы "трэнд "беларускасці", наша суразмоўца сказала, што нацыянальная культура займае асаблівае месца ў працы ПК. Прытрымлівацца моды тут нават няма патрэбы. Слова ж "трэнд" у дачыненні да нацыянальнай культуры спадарыні Федчанка не падабаецца. Але з конкурсамі, на якіх практычна ўсе дзеці спяваюць сусветныя хіты на арыгінальных мовах, а беларускай песні там няма, нешта трэба рабіць.

Новыя лялькі для ўзорнага тэатра лялек "Бураціна" робіць яго ж мастак, ён латае і старыя. Тое зразумела: выраб і рамонт "на баку" каштуюць немалых грошай. І "дамаслага" майстра Ірына Аляксееўна нахвальвае: "Атрымліваецца ў яго нават лепш, чым у тых, хто ў гэтай справе адмыслоўца".

А яшчэ "Будаўнік" перыядычна дае прытулак трупе Мазырскага драматычнага тэатра імя Івана Мележа, якая паказвае ў ПК свае пастаноўкі. Будынак МДТ згарэў у лютым 2013 года, і пакуль няма дакладных дат новых улазін...

"Танцавальны самвыдат"

У бібліятэкі Мікола Козенка наведваўся ў юнацтве нерэгулярна (акрамя той, што была пад рукой — у школе-інтэрнаце, дзе наш герой бываў, натуральна, часцей). Зімой гуляў у хакей і бегаў на лыжах, летам — футбол, але галоўнае — дапамога маме па гаспадарцы. Падпрацоўваў і ў калгасе. Вясной — пасяўная. Летам ды восенню — уборачная. Але знаходзіўся час і для кніг (не толькі тых, што ўваходзілі ў школьную праграму). У дзяцінстве аддаваў перавагу, скажам, "Міколку-паравозу" Міхася Лынькова, часопісам "Мурзілка", "Бярозка". Сталеючы, Мікола перайшоў да твораў, якія фармавалі яго ўжо як асобу: "Дудка беларуская" Францішка Багушэвіча, "Скрыпка беларуская" Цёткі. Зараз чытае "Мяжу" Андрэя Федарэнкі. Прафесійнай жа харэаграфічнай літаратуры ў бібліятэках наогул было мала, па беларускай харэаграфіі — яшчэ менш. Складана і працаёмка гэта — пісаць пра танцы і прафесійна, і жывой мовай.

...Прасторныя, зіхоткія чысцінёй памяшканні Цэнтральнай бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна. (Асабліва мяне ўразіў пакой, дзе насельніцтву аказваюць платныя паслугі (сканар, капіравальны апарат, дзе ўсё з выгляду новае, сучаснае) і сектар інфармацыі, які прапануе спецыяльныя бібліятэчныя паслугі.) І супрацоўнікі — адухоўленыя, добразычлівыя і, вядома, закаханыя ў сваю працу. Намеснік дырэктара Мазырскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Ганна Кухарава даводзіць да нас "чарт" найбольш запатрабаваных айчынных пісьменнікаў: Батракова, Лісіцкая, класікі (тых, што чытаюць школьнікі і студэнты). Беларускамоўныя кнігі попытам карыстаюцца — такім жа, як і па ўсёй краіне. Далучаюць да іх наведвальнікаў, праводзячы дэкады беларускай і краязнаўчай літаратуры. Нейкі час пасля іх заканчэння аддача ад мерапрыемстваў адчуваецца, а на 2016 год да іх дадасца яшчэ адзін праект па папулярызацыі такіх твораў. Да таго, што бібліятэкі сёння становяцца збольшага інфармацыйна-забаўляльнымі ўстановамі, у ЦБ ставяцца з разуменнем і практыкуюць унутраныя "святочныя" і выязныя мерапрыемствы, накіраваныя на прыцягненне чытацкай аўдыторыі.

А хвалюе "пушкінцаў" пытанне камплектавання: не ў тым аб'ёме, у якім хацелася б, набываецца для яе самая розная літаратура, не ўсякае дарагое і "хітовае" выданне могуць яны сабе дазволіць — фінансы спяваюць рамансы і ў гэтым аспекце. Аптымізацыя, натуральна, кранула і ЦБ: так, функцыі гардэробшчыка выконвае тэхнічны служачы...

Кнігі па харэаграфіі, дарэчы, у бібліятэцы мы знайшлі. Сітуацыя з імі… скажам так, не змянілася: і сёння адпаведныя падручнікі і папулярныя выданні рэдка сустрэнеш што ў бібліятэках, што ў крамах.

— Мы — тыя, хто выкладае, ставіць танцы, — як правіла, малюем і апісваем іх самі — рухі, паставы і гэтак далей. Вось і вучым па такім "самвыдаце", — канстатуе Мікола Аляксеевіч. — Ці па тым, што было напісана па гэтай тэме ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Наклад жа сучасных і адносна сучасных выданняў, метадычак, у якіх хоць неяк прадстаўлены беларускія танцы, вельмі невялікі. Добра, што ў нас ёсць Інстытут культуры Беларусі, які нешта робіць у гэтым кірунку.

"Нармальны боршч", — як сказаў бы мой знаёмы кулінар. XXI стагоддзе на двары — з усімі наступствамі. А сакрэты нацыянальнага танцавальнага мастацтва перадаюцца з пакалення ў пакаленне ў тым ліку і ранейшым шляхам — архаічным, вусным: як адна бабуля распавяла, як адзін дзядуля казаў, пасля ўсё гэта намалюецца... А можа, сапраўды такая папяровая літаратура сёння не патрэбная, калі ёсць Інтэрнэт, у якім дэманстратары раскладуць любы танец на пэўныя па? Урэшце, трэба і тое, і іншае, перакананы Мікола Аляксеевіч, але відэаматэрыялаў па беларускай харэаграфіі таксама амаль няма...

...І некалькі абзацаў пра "Берагіню"

Козенка са шкадаваннем заўважыў, што за ўсе гады існавання фестывалю "Берагіня" не так шмат, як хацелася б, мазырскіх выканаўцаў і калектываў удзельнічала ў яго мерапрыемствах менавіта ў Акцябрскім (у асноўным іх можна было ўбачыць у рамках форуму на іншых пляцоўках). Чаму? Па словах этнахарэографа, паводле афіцыйных дакументаў, нельга павялічыць агульную колькасць удзельнікаў фэсту, а кожная вобласць можа быць прадстаўлена на ім пэўным лікам.

Аксіёмай з'яўляецца тое, што народная культура мае патрэбу ў падтрымцы на дзяржаўным узроўні. Але такой, якой яна ёсць сёння, лічыць Мікола Аляксеевіч, недастаткова. Так, на яго думку, неабходна асобная ўстанова, гэткі асобны цэнтр беларускай культуры, які б на практыцы каардынаваў па ўсёй краіне працэсы, якія адбываюцца ў аматарскай творчасці, звязаныя з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Такая структура была, кажа Козенка, — Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, але некалькі гадоў таму яго расфарміравалі. Разам з гэтым аказаліся парушанымі многія сувязі паміж тымі, хто займаўся традыцыйнай культурай на месцах, прыпыненыя ці спыненыя наогул некаторыя цікавыя праекты. Як адбіваецца тое на народнай культуры? Таму ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў як могуць выкручваюцца, каб паставіць канкрэтны народны танец у першаснасці. Адна з прычын — не стае студэнтаў: не прагне моладзь прысвяціць сваё жыццё такому мастацтву. А потым па тэлевізары пад выглядам аўтэнтыкі нам паказваюць "шоу" з фольк-адценнем. "А як фінансуецца народная культура?" — задае пытанне Козенка і сам жа на яго адказвае:

— Асноўнае фінансаванне двух апошніх форумаў "Берагіня" лягло на плечы вобласці і раёна, а фестываль мае статус рэспубліканскага… І як ужо мясцовыя ўлады выходзілі са становішча?.. Я, як яго аўтар і кіраўнік, за свой кошт абзвоньваў удзельнікаў "Берагіні". Гэта нармальна?..

Але ў песімізм Мікола Аляксеевіч не ўпадае. У планах правядзенне ў рамках мерапрыемства ў розных рэгіёнах навукова-практычнай канферэнцыі "Традыцыйная культура і дзеці" (гэты праект ужо быў апрабаваны), акцыі "Народная проза", конкурсу танцавальных пар, фестывалю аўтэнтычнага мастацтва... Праўда, некаторым гэтым планам... каторы год...

К

Сцяпан Бурштын, заснавальнік першага прыватнага музея на Маларытчыне.

маганнямі мясцовага краязнаўцы Сцяпана Бурштына, які працуе спецыялістам па кормавытворчасці СВК "Макраны". Месціцца музей ва ўласным доме Сцяпана Канстанцінавіча.

Міні-музей гісторыі СССР займае невялічкі пакой на другім паверсе. Месца для экспанатаў, якія размяшчаюцца тэматычна, адведзена не так і багата. Аднак гэта не замінае прасачыць асобныя этапы існавання колішняй дзяржавы.

Са з'яўленнем новых экспанатаў тэматычныя межы музея пастаянна пашыраюцца. У ім можна цяпер пабачыць матэрыялы па чатырох асноўных раздзелах: "Ваенная гісторыя", "Этнаграфія", "Летапіс калгаса", "Гісторыя маёй сям'і". У калекцыі, напрыклад, газеты, датаваныя 1921 годам, кнігі, выдадзеныя пасля 1930-га, самавары, адзін з першых савецкіх тэлевізараў… Асаблівы гонар Сцяпана Бурштына — 23 савецкія фотаапараты, сорак мужчынскіх галаўных убораў, 120 шэўронаў, якія сабраны з шасці краін, а таксама — чатыры пераходныя сцягі. Цяпер Сцяпан Бурштын захапіўся зборам знакаў пагранічных войскаў.

Музей Сцяпана Бурштына адкрыты для ўсіх. Пазнаёміцца з экспазіцыяй мог ужо не адзін дзясятак чалавек. Бываюць тут на экскурсіях і вучні бліжэйшых школ. Некалькі разоў прыязджалі ў музей краязнаўцы з Брэста, Пінска. Наведвалі музей госці з Расіі, Польшчы, Германіі, Украіны…

Сцяпан Бурштын актыўна супрацоўнічае па краязнаўчых пытаннях не толькі са школамі і бібліятэкамі, але і з Палескім дзяржаўным універсітэтам, Кіеўскай грамадскай арганізацыяй "Таварыства ветэранаў разведкі ваенна-марскога флоту". Ён таксама з'яўляецца членам гісторыка-патрыятычнага клуба "Пошук" з Пінска.

Мікалай НАВУМЧЫК
Фота аўтара

Удзельнікі святочнай шоу-праграмы ў аграгарадку "Копці". / Фота Алены АЛІМАВАЙ

Віцебшчына / Дзякуй за якасць!

Напярэдадні Новага года мы з сынам-пяцікласнікам Мілаславам гасцілі ў сваякоў з аграгарадка "Копці" Віцебскага раёна. Яны і запрасілі нас на сустрэчу з зоркамі беларускай і расійскай эстрады, што мелася адбыцца ў мясцовым Доме культуры.

Са сцэны нас віншавалі Дзед Мароз (Дзмітрый Кавалеўскі) і Снягурка (Таццяна Німалан). А потым на сцэну выходзілі, скажам, Надзея Кадышава, Кацярына Шаўрына, Алсу, Сяргей Звераў, Юрый Шатуноў, Верка Сярдзючка, Ксенія Сітнік, Ала Пугачова, Эдзіта П'еха… Артыстычнае пераўвасабленне ў зорак зрабілі Тамара Трыфанава, Таццяна Доўгая, Тамара Спірына, Ліза Нікіціна, Валерыя Рабчынская, Святлана Абаімава, Максім Ратомскі, Валерыя Мяркур'ева, Настасся Абаімава, Святлана Асон, Людміла Бальшакова.

Апладысменты не сціхалі. Напрыклад, падабенства Валянціны Корбан да Нані Брыгвадзэ было ва ўсім: і ў знешнім выглядзе, і ў голасе, і ў манеры выканання шырока вядомай песні "Снегапад".

Добра выступаў харэаграфічны калектыў "Юла". Прызнаюся шчыра, не мог адвесці вачэй ад кожнага руху ў танцы юнай Крысціны Андросавай. А дырэктар Дома культуры Наталля Сакалова парадавала танцам "Я зачаравала цябе".

У канцэрце ўдзельнічалі самадзейныя артысты рознага ўзросту: ад малодшых школьнікаў (вакальная студыя "Карамелькі") да тых, хто ўжо знаходзіцца на заслужаным адпачынку (вакальная студыя "Сузор'е"). На эмоцыі гледачоў станоўча ўплывалі светлавое і музычнае афармленне кожнага нумара, лагічная завершанасць праграмы. Дзякуй, работнікі культуры, за высокую якасць вашай працы!

Аляксей СОЛАХАЎ,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі і методык дашкольнай і пачатковай адукацыі Мазырскага дзяржпедуніверсітэта імя Івана Шамякіна

Крэслы, "ключы", пяць гітар

Чым захапляюцца музыканты па-за сцэнай?

Хто такія сапраўдныя музыканты? Гэта людзі, якія займаюцца... не толькі музыкай. Прапануем зірнуць на некаторых творцаў праз прызму іх захапленняў, дзякуючы якім нашы героі не стаяць на месцы і ў асноўнай галіне.

Біжутэрыя, выкананая Аленай Сало ў розныя гады, і сама творца з уласнай карцінай.

Аляксей Доўнар і яго вырабы, сярод якіх і "cigarbox".

Алена Вашкевіч і яе творы: рыбкі (у руцэ) і пано.

"Туманны ранак" і яе аўтар Вольга Аліпава.

Вінтажны гук

Аляксей — гітарыст беларускага гурта "CherryVata". І адначасова вядомы не толькі ў Беларусі мастак, які выконвае складаныя работы па роспісе храмаў. У вольны ж час — майстар па рэстаўрацыі і вырабе гітар.

У кватэры Аляксея бясконца музычна. Адно з галоўных упрыгожанняў — незвычайныя гітары, размешчаныя на асобнай сцяне. Аляксей прызнаецца: калі сыходзіў з гурта на няпэўны час, думаў пра тое, каб прадаць адзіную гітару, але бацька пераканаў не рабіць тое. Пасля амаль пяці гадоў без музыкі Аляксей пачаў сумаваць па тых часах, калі марыў граць "Metallica", вырашыў, што трэба здзяйсняць мары і… замовіў у Амерыцы першы "Gibson". "Пачаў разбірацца, паглыбляцца ў тэорыю вінтажнага гуку, — распавядае ён, — потым неяк набыў патрыманую паўакустыку, яна пахла старым дрэвам, была паедзеная жучкамі. Вырашыў паспрабаваць змяніць колер: яна была чорная, а мне хацелася чырвоную". Матэрыялы знайшліся ў іканапіснай майстэрні, але ў выніку музыкант пакрыў выраб шэлакам, зрабіў парэпінкі і адпаліраваў уручную. Гітара загучала лепш і, па словах цяперашняга ўладальніка, нікому больш не дастанецца.

Пасля першага ўдалага эксперыменту рэстаўрацыя стала выдатным дадаткам да музычна-мастацкай кар'еры і новым цікавым хобі. Аляксей кажа, што пакуль не ўспрымае рэстаўрацыю гітар як працу і заробак, а робіць гэта ў сваё задавальненне, але матэрыялы і час дарагія, таму "часам атрымліваецца нават сабе на страту".

Аляксей, купляючы гітару, практычна адразу бачыць, што ў ёй трэба змяніць для паляпшэння гуку. Так, інструмент з тонкім і парэпаным лакам заўсёды гучыць лепш. Вывучэнне вінтажных інструментаў, старых прыёмаў працы і эксперыменты з лакам і фурнітурай прыносяць свой плён. Напрыклад, адна з культавых амерыканскіх гітар, якую ён прадэманстраваў, некалі мела вінна-чырвоны колер. Аляксей замяніў усе дэталі, а таксама колер на залаты, каб гітара атрымалася "як з 50-х". А яшчэ ён апрацаваў лак па адмысловай тэхналогіі, паколькі такое пакрыццё не так стрымлівае рэзананс драўніны.

Іншую гітару майстар зрабіў са старой скрынкі з-пад дрыля, узяўшы за ўзор традыцыйны амерыканскі "cigarbox" (інструмент з цыгарнай скрынкі). Тут Аляксей рэалізаваў сваю даўнюю ідэю татуіровак на дрэве.

Сям'я і блізкія пазітыўна ставяцца да захаплення Аляксея. Адзінае, што засмучае яго самога, — праз вялікую колькасць хобі часу на ўсё проста не хапае. Дапамагаюць аўдыякнігі, паколькі чытаць няма калі. "Але насамрэч ігра на інструменце — гэта як медытацыя. Адчуць гук, які адклікаецца рэзанансам па ўсім целе. Думкі адразу даводзяцца да ладу", — усміхаецца Аляксей і пачынае найграваць блюз...

Прырода творчасці

Алена Сало — салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Але па нашай просьбе Алена прадэманстравала нам маміны вышытыя карціны і сказала, што яе захапленне творчасцю, мастацтвам пачалося якраз з маці. Пакуль дачка займалася музыкай, маці-эканаміст на самаробным станку "майстравала" свае творы. Пачалася ж любоў Алены да творчага самавыяўлення пасля таго, як маці трэба было дапамагчы зрабіць палічку каля ложка.

"Наогул я ўсё раблю разам з дачкой. Часта, сама таго не ведаючы, яна падкідвае мне выдатныя ідэі, — распавядае Алена. — Напрыклад, не так даўно яна пачала захапляцца птушкамі, і мы сталі больш часу надаваць прыродзе, слухаць птушак, ствараць для іх кармушкі і вырошчваць насенне".

А пачалося ўсё з эпапеі, якую Алена і дачка Ліза хорам называюць "ключы". Уваходзячы ў іх кватэру, адразу бачыш арку ў праходзе, перакрытую заслонай з падвешаных на нітках ключоў. "Мне падабаецца музыка, якую яны ўтвараюць", — загараюцца вочы Алены, калі яна праводзіць рукой па самаробным творы мастацтва. Ключы б'юцца адзін аб другі, ствараючы меладычныя гукі. На пытанне, дзе ўзялі столькі "сыравіны", яна ўсміхаецца і кажа, што каштоўны метал самі збіралі разам з дачкой.

Алена дэманструе нам свае вырабы з дрэва: лесвічка для двухпавярховага ложка, невысокае, але арыгінальнае крэсла, на якім яны з дачкой асвойвалі тэхніку выпальвання па дрэве, этажэрку для камп'ютара. "Крэсла зроблена з апрацаваных абрэзкаў з крамы "Зрабі сам", якія звычайна выкідаюць, — распавядае Алена. — І кожны раз я жахаюся, думаючы, у што ператвараецца наша зямля без уважлівага да яе стаўлення".

Цяпер Алена хоча намаляваць серыю партрэтаў дачкі ў вобразах розных птушак. Ужо ёсць карціна, дзе Ліза ў пёрках качкі-мандарынкі, але паколькі самой артыстцы твор здаецца не зусім удалым праз недакладнасці колеру апярэння, яна называе работу толькі эскізам. "Ліза бачыць мастацтва ў якасці, а я — ва ўсім", — кажа артыстка. Акрамя таго, сяброўкі сям'і часцяком становяцца ў чаргу па модныя аксесуары ручной работы ці арыгінальныя прадметы інтэр'еру.

Натхняецца Алена, у асноўным, прыродай, і калі сіл не застаецца зусім з-за бясконцых рэпетыцый і сямейных клопатаў, яна перасаджвае кветкі пад домам. "Аднойчы мяне нават прынялі за новую прыбіральшчыцу, — смеючыся, распавядае салістка Беларускай оперы. — Але цяпер усе суседзі ведаюць мяне, іх ужо нічога не здзіўляе — нават дзякуюць за прыгажосць пад балконамі". Артыстка кажа, што для таго, каб загарэцца новай ідэяй, ёй нічога асаблівага выціскаць з сябе не трэба. Проста крыху цішыні і прыроды. "Творчасці заўсёды недастаткова, а натуральны свет дапамагае ўбачыць усё з іншага боку, як бы знутры".

Невядомае ад рок-спявачкі

Вольга Аліпава — бадай першая ў Беларусі рок-дзіва. Цяпер, расчараваная ў музычным рынку, спявачка сышла са сцэны і выкладае ў школе англійскую мову. А ў вольны час піша дзівосныя карціны.

У школе Вольга слухала "The Beatles" і "The Rolling Stones", потым спявала іх песні ў гурце "Наследники". Калі пасля першага курса ёй апавялі пра знакаміты гурт братоў Казлоўскіх, яна прыйшла да іх і нахабна заявіла, што будзе працаваць з імі. І Вольга скарыла іх сваім голасам. "А маляванне прыйшло да мяне неяк адразу, яшчэ ў школе. Я хацела спяваць — і я спявала. Хацела маляваць — малявала", — распавядае спадарыня Аліпава.

Пачынала Вольга з партрэтаў улюбённых музыкантаў. Яна не вучылася ў мастацкай школе, не наведвала гурткі жывапісу, не захаплялася складанымі тэхнікамі. Дома ў яе стаяць сотні кніг пра мастакоў, альбомы, даведнікі. Вольга кажа, што менавіта па іх яна і вучылася маляваць. Сярод яе сімпатый — Ван Гог і Рэмбрант.

Дарэчы, спявачка-мастачка яшчэ і вершы піша, але, прызнаецца Вольга, карціны для яе — дзеці, а вершы яна ўспрымае толькі як часовы занятак, "калі трэба". Патрабуецца сябру падарунак на дзень нараджэння зрабіць — напіша верш.

Бацькі Вольгі былі ў захапленні, калі яна напісала першую карціну, а вось многія сябры да гэтага часу пра жывапіс каляжанкі не ведаюць. Тыя, хто бываў у яе дома, вядома, бачылі творы, але не давалі ацэнак. Аліпава ж найбольш любіць пісаць прыроду, хоць у чужых карцінах ёй падабаецца нават постмадэрнізм. Яна распавяла: калі ездзіла ў Крым, убачыла з машыны незвычайны пейзаж, сфатаграфавала яго, а потым намалявала. Хоць бываюць у яе і цалкам прыдуманыя сюжэты, але мастачка ўпэўненая, што дзесьці ў свеце яны абавязкова існуюць. А натхняюць Вольгу на творчасць толькі яе ўлюбёныя гурты і прырода.

Дызайн і фартэпіяна

Алена Вашкевіч — старшы выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэат міжнародных джазавых фестываляў, таленавітая піяністка. А яшчэ яна з'яўляецца крэатыўным дызайнерам і афарміцелем будаўнічых крам.

Пачалася дызайнерская дзейнасць Алены, можна сказаць, з дзяцінства. Яна шыла сабе ўборы, рабіла нейкія ўпрыгожанні. Але пазней усвядоміла, што і вобразы, народжаныя музыкай, патрабуюць увасаблення. І тады піяністка пайшла на дызайнерскія курсы, адвучылася там пэўны час і зразумела, што аснова ў яе ўжо ёсць. "Упершыню я падкінула ідэю наконт афармлення чалавеку, які пытаўся парады ў гэтай справе, — распавядае Алена. — Але ён сказаў, што за такое ніхто не возьмецца. І тады ўзялася я".

Для Алены надзвычай важны водгук: калі яна выконвае музыку ды піша карціны, калі людзі глядзяць на яе працы ў крамах... (Цяпер Алене тэлефануюць з той самай, першай "замовы" і распавядаюць, што міма яе работ ніхто ніколі не праходзіць.) Піяністка кажа, што тут як у тэатры: калі ёсць абмен эмоцыямі, значыць, ты чагосьці дамогся. І неабавязкова гэтыя эмоцыі або думкі павінны быць адно станоўчымі.

Алена распавяла пра тое, як пасля аднаго з канцэртаў зразумела, што мае патрэбу ў нейкіх невялікіх рэчах, якія будуць нагадваць пра мінулы выступ. І паколькі яна па гараскопе Рыбы, стала рабіць бірулькі-рыбкі. Кожная адпавядае свайму настрою на канцэрце: вось джазавая, вось летняя адпачывальніца, а побач з ёй класічная, строгая.

Час наша гераіня навучылася планаваць так, каб абмінаць непатрэбнае і пакідаць толькі тое, што цяпер сапраўды пойдзе добра, дзе ёсць пэўныя ідэі і задачы.

Калі натхненне пакідае піяністку і яна разумее, што адзінага цэлага ў галаве не складаецца, падзеі Алена не прыспешвае. Вядома, заўсёды пакутліва рабіць штодзённыя справы, калі разумееш, што нейкага пазла для канчатковага варыянта тваёй задумы не хапае. Але потым у рэшце рэшт дапамагае якая-небудзь прыродная з'ява — дрэва, неба або птушка. Паглядзіш раптам на яе — і зноў усё па палічках, можна ісці і тварыць далей.

Вольга СТАРАВОЙТАВА,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ
Фота Вольгі ХОМЫ

Мы пісалі ўжо, што ў снежні ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрылася выстава "Гоя… Пікаса" з калекцыі мадрыдскага Каралеўскага музея прыгожых мастацтваў Сан-Фернанда. Сёння прадстаўляем матэрыял пра некаторыя "зрэзы" экспазіцыі. Гэтыя імёны даўно і добра ведаюць усе, хто цікавіцца сусветным выяўленчым мастацтвам, і таму я іхнія біяграфіі апускаю.

Барыс КРЭПАК

Пабла Пікаса. "Скульптар, мадэль, якая стаіць на каленях, і скульптурная галава".

Пабла Пікаса. "Сляпы Мінатаўр, якога вядзе маленькая дзяўчынка ўначы".

Два іспанцы ў адной ладдзі

Пачну з Пабла Пікаса, практычна нашага сучасніка, хаця твораў яго ў экспазіцыі, у параўнанні з работамі Гоі, зусім няшмат — усяго 15. Затое яны гледачу менш знаёмыя, бо экспануюцца ўпершыню ў нашай краіне, а галоўны графічны твор Гоі — серыя "Капрычас" у колькасці 80 аркушаў — ужо дэманстраваўся ў нашым музеі ў чэрвені 1998-га. Тая калекцыя — уласнасць банкаўскага цэнтра "Sa Nostra" з Пальма-дэ-Маёркі ўпершыню была вывезена за межы Балеарскіх астравоў і з'явілася буйным крокам на шляху культурнага супрацоўніцтва Беларусі і Іспаніі. І вось "другое прышэсце" вялікага Гоі ў нашу краіну. Гэтым разам побач з некаторымі аркушамі знаёмай серыі "Капрычас" глядач пабачыў і афорты з іншых цыклаў мастака: "Бядоты вайны", "Дыспаратас" і "Таўрамахія".

Такім чынам, Пабла Пікаса

Перш за ўсё — "Сюіта Валара". Гэта серыя з сотні афортаў у неакласічным стылі, якую ў 1930 годзе замовіў мастаку вядомы арт-дылер, выдавец і калекцыянер Амбруаз Валар. Так, той самы Валар, на замову якога Марк Шагал рабіў ілюстрацыі да Бібліі і да "Мёртвых душаў" Гогаля і які запрасіў эмігранта Шагала з Берліна ў Парыж.

Апошнія аркушы "Сюіты" Пікаса зрабіў у сакавіку 1939-га — за чатыры месяцы да гібелі заказчыка ў аўтакатастрофе. І каб ушанаваць памяць Валара, мастак усе гравюры, аб'яднаўшы ў адну серыю, назваў яго імем. У экспазіцыі прадстаўлены толькі некалькі аркушаў з гэтага цыкла. У час працы над гравюрамі 50-гадовы жаваты Пікаса быў у любоўнай сувязі з юнай Марыяй-Тэрэзай Вальтэр, якая яму прыхваткамі пазіравала. Рабіў ён свае афорты па класічных канонах і, не адрываючы рукі, так падаваў контуры чалавечага цела, што атрымліваўся ідэальна завершаны вобраз — без лішніх штрыхоў і падрысовак. Рысавальшчыкам жа ён быў ад Бога. У гэтым сэнсе я магу яго параўнаць з Дзюрэрам, Рэмбрантам ці Энграм.

Галоўная тэма "Сюіты" — летуценны аповед мастацтва пра сябе, дзе прасочваецца думка пра гарманічны сінтэз (ці сімбіёз) цудоўнай прыроды і ідэальнай натхнёнай творчасці. Наогул, аркушы не звязаны нейкай агульнай тэмай — яны вельмі разнастайныя па тэматыцы. Ёсць і выпадковыя сюжэты: ад "Студыі скульптара" да інтэрпрэтацый вобраза Мінатаўра, ад неакласічных "ню" да сюррэалістычных сцэн і персанажаў, ад вакханак і быкоў да чыста эратычных адлюстраванняў. "Фаўн, які раскрывае спячую", "Рэмбрант і дзве жанчыны", "Скульптар, мадэль, якая стаіць на каленях, і скульптурная галава", "Скульптар і мадэль, якая стаіць", "Мінатаўр, які атакуе амазонку", "Вакхічная сцэна з Мінатаўрам" — вось толькі некаторыя аркушы, прывезеныя з Мадрыда.

Мінатаўр, гэтае міфічнае стварэнне, сімвал насілля, жывёльнай пажадлівасці — адзін з любімых персанажаў Пікаса. Мне здаецца, што Мінатаўр, які балюе, б'ецца, перамагае ворага, разлютавана любіць усякіх там вакханак і амазонак, — у нейкай ступені сам мастак. Але жудаснае страшыдла з мордай звера зведала паразу ад разбуральнай сілы: яно аслепнула. І гэты Мінатаўр блукаецца ў вечнай цемры, выючы ад тугі. А дзяўчынка, якая прыйшла з далёкага мінулага Пікаса, з букетам кветак ці голубам у руках, вядзе яго, знішчанага дашчэнту, на бераг мора. Пра гэта аркуш "Сляпы Мінатаўр, якога вядзе маленькая дзяўчынка ўначы"… Няма сумнення, што большасць элементаў з "мінатаўрамахіі" ўвайшла ў галоўны жывапісны твор Пікаса — легендарную карціну "Герніка".

У пачатку 1930-х з'явіўся і ілюстрацыйны цыкл Пікаса — да навэлы Бальзака "Невядомы шэдэўр", некалькі аркушаў з якога таксама прадстаўлены ў экспазіцыі. Аднак тут ёсць адна праблема: у якой ступені да іх прымяніма паняцце ілюстрацый? Справа ў тым, што на працягу жыцця мастака, які не любіў працаваць на замову, з'яўлялася шмат кніг, на тытульным лісце якіх значылася імя Пікаса як ілюстратара. Але гэта былі проста ўстаўкі ў літаратурны тэкст, падабраныя з раней зробленых работ нават не самім мастаком, а выдаўцом ці аўтарам кнігі. У дадзеным выпадку заказчык Амбруаз Валар проста выкарыстаў у якасці ілюстрацый да твора Бальзака некаторыя з ранніх пікасаўскіх гравюр, прысвечаных тэме адносін мастака і яго аголенай мадэлі, гэтак званых адносін творцы і аб'екта натхнення. Валар сабраў у гэтай кнізе самыя розныя творы Пікаса: ад абстрактных дыяграм і кубісцкіх прыдумак да афортаў, якія дзівосным чынам трапілі ў кантэкст бальзакаўскай гісторыі пра старога звар'яцелага жывапісца Фрэнхофера, які правёў дзесяць гадоў перад таямнічым партрэтам "цудоўнай Нуазезе".

З іншага боку, прычым тут, напрыклад, ілюстрацыя "Бык і конь" (бык, які прыціскае каня да борта арэны) да сюжэта? І многія іншыя, якія прынесены ў тэкст, так бы мовіць, выпадковым ветрам. Хаця, скажам, кампазіцыі "Мастак паміж дзвюх мадэлей" ці "Тры аголенныя мадэлі стаяць" — яшчэ куды не ішло; нейкім чынам іх можна прыцягнуць за вушы да дзіўнай гісторыі ўзаемаадносінаў старога Фрэнхофера і яго маладых вучняў Парбуса і Пусэна.

Павінен сказаць, што спачатку гэту кнігу з ілюстрацыямі Пікаса грамадства наогул не прымала. Яе ацанілі як поўны правал у выдавецкай дзейнасці Валара. Пісалі, што агульнае ўражанне хаатычнае, рознастылёвыя аркушы сваёй непамернай колькасцю (больш за 120 малюнкаў!) падавілі тэкст і нават буйнымі блокамі недаравальна абрэзалі яго на кавалкі. На што праніклівы Валар глыбакадумна заўважыў: "Кожны новы твор Пікаса выклікае скандал да той пары, пакуль здзіўленне не змяняецца захапленнем". І — меў рацыю. Хаця цяжкавырашальныя пытанні ў адносінах да гэтых сапраўды хаатычных ілюстрацый існуюць да сёння…

К

Заканчэнне — **у наступных нумарах.**

А які капітал?

Поспех у Парыжы — запаветная мара кожнага мастака. Сёлета яна здзейснілася для Валянціны Шоба з Гродна і Сяргея Парцянкова з Гомеля. Яны ўшанаваны прэміяй Тэйлара на выставе "Art Capital" у выставачным комплексе Гран-Пале.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

У выставачным комплексе Гран-Пале ў Парыжы.



Творы беларускіх аўтараў у экспазіцыі парыжскага музея.

Парыжскія апладысменты беларусам

Штогод згаданай прэміяй адзначаюцца жывапісныя і скульптурныя творы. Пад жывапісам маецца на ўвазе тое, што малюецца на паперы пэўнага фармату пастэллю альбо фарбамі на воднай аснове — традыцыйныя акварэль, гуаш, тэмпера, да якіх цяпер дадаўся акрыл. Для скульптуры ў дадзеным выпадку такіх абмежаванняў па фармаце і тэхніцы выканання няма.

У сёлетнім парыжскім салоне бралі ўдзел дзве тысячы мастакоў з сарака краін. Беларусь тут была прадстаўлена ўпершыню. Усяго ў беларускім раздзеле выставы экспанаваліся работы адзінаццаці творцаў. Па словах Валянціны Шоба, перамога ў такім прадстаўнічым конкурсе была, безумоўна, жаданай, але падавалася малаверагоднай. І не таму, што беларускія мастакі чымсьці саступаюць сваім замежным калегам. Наадварот — у сэнсе прафесіяналізму могуць яшчэ і фору даць. Проста ў мастацтве, калі гаворка ідзе пра ацэнку твора, пануе суб'ектывізм і ўсталяваныя стэрэатыпы. Беларусь жа, як нядаўні ўдзельнік арт-супольнасці з яе законамі, наўрад ці магла прэтэндаваць на першынство. І тым не менш, яна апярэдзіла старажылаў салона: прэстыжную прэмію атрымалі адразу два беларускія мастакі. Неверагодна, але факт… Спадарыня Валянціна з гэтай нагоды адзначае цудоўную працу арганізатараў з беларускага боку, якія прыклалі шмат намаганняў, каб прадставіць беларускае мастацтва найлепшым чынам. І першым у гэтым шэрагу яна называе Віктара Альшэўскага — не толькі жывапісца, але і куратара нацыянальнага павільёна.

Для спадарыні Валянціны бадай галоўная выснова з парыжскага салона — тое, што на Захадзе чыстага мастацтва, як мы звыкла яго разумеем, ужо няма. Яе дачка, якая зараз вучыцца на дызайнера, агледзеўшы разам з маці экспазіцыю "Art Capital", катэгарычна заявіла: "Мы такое робім на другім курсе!" Валянціна лічыць, што пры ўсім юнацкім максімалізме будучы дызайнер пэўную рацыю мае…

Работа, створаная адмыслова для парыжскай выставы, для творчасці Валянціны Шоба не ўласцівая, бо не выклікае станоўчых эмоцый. Па словах аўтара, яна хацела асэнсаваць вайну як псіхічную анамалію. Пачынаецца вайна з палымяных заклікаў абараніць свабоду і веру, а вядзе да вялікай крыві, да пераробкі чалавека ў нелюдзя. Мастачка мяркуе, што, магчыма, яе думкі пра недасканаласць чалавечай натуры набылі актуальнасць на тле канфліктаў у свеце, сведкамі якіх мы з'яўляемся сёння.

На пытанне карэспандэнта "К", ці не хацела б яна зараз некаторы час пажыць і папрацаваць на Захадзе, каб набыць новы досвед, пашырыць далягляды творчасці, мастачка адказала: "Не". Ёй утульна жыць і зручна працаваць у Гродне. Ёсць у яе, дарэчы, і майстэрня ў Польшчы: туды яна выбіраецца час ад часу.

Тое, што робіць другі парыжскі лаўрэат Сяргей Парцянкоў, лічыць скульптурай можна толькі ўмоўна. Яно хутчэй адпавядае шырокаму разуменню "пластыка". З металу, які калісьці быў дэталямі машын і механізмаў, ён робіць фантазіі на тэмы істот, на якіх, відаць, Бог руку набіваў, перш чым ушчыльную заняцца чалавекам. Ягоныя птушкі, рыбы, жывёлы, насякомыя выглядаюць як агрэсіўныя прыхадні з серыялу пра зорныя войны, але ў фаната-"металіста"яны здольныя выклікаць замілаваную ўсмешку.

Мяркуючы па інтэрв'ю спадара Сяргея, да сваіх эфектных, амаль бездакорных у тэхнічным сэнсе работ ён ставіцца без залішняй сур'ёзнасці і ніякай філасофіі пад уласную творчую практыку не падганяе. Ён проста таленавіта робіць тое, да чаго мае схільнасць. Пакуль што яго кампазіцыі былі добра вядомыя ў коле носьбітаў і заўзятараў маладзёжнай субкультуры. Цяпер жа, пасля парыжскага поспеху, і Сяргей Парцянкоў можа разлічваць на шырокі розгалас.

К

Тры моры тэатра з Гродна

Згадваючы гісторыю Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, нельга не назваць імя Ігара Пятроўскага, якога не стала дзесяць гадоў таму. Менавіта ён у 1980-х як новы мастацкі кіраўнік і дырэктар трупы (з 1984-га па 1991-шы) скалануў рэпертуарную аднатыпнасць, раскрыў творчыя магчымасці і пацвердзіў жыццяздольнасць калектыву.

Ігар Пятроўскі.

І вось прыходзіць Пятроўскі…

А перыяд гэты, больш як трыццаць гадоў таму, для Гродзенскага абласнога драмтэатра стаўся даволі складаным. Змяняліся галоўныя і чарговыя рэжысёры, трупу пакінула частка сапраўды добрых акцёраў, на якіх трымалася істотная частка рэпертуару. Калектыў перажываў часы, калі не задавальнялі ні ўзровень рэжысуры (і насамрэч часцяком невысокі), ні рэпертуар, што не даваў магчымасці падтрымаць рэпутацыю трупы. А тэатр пакрысе губляў свой прэстыж у горадзе. І свайго гледача. Фарсіраванню падзей у 1984-м мог бы паспрыяць пераезд тэатра ў новы будынак. І сапраўды, уваходзіны падаравалі не толькі новы дом і новую сцэну, але і надзею на цікавыя творчыя сустрэчы ды новыя таленавітыя спектаклі.

І вось прыходзіць Ігар Пятроўскі. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны з апошняга прызыву, які на ўсё жыццё загартаваў характар у паветраным дэсанце. За яго плячыма навучанне ў Маскве і Ленінградзе, служба рэжысёрам у тэатрах Казані, Таліна, Валгаграда, Калінінграда, Львова, Кішынёва, Уладзівастока, Арла, Ліепаі, шэраг пастановак у тэатрах Кіева, Ленінграда, Адэсы, Душанбэ, Грознага... Менавіта Ігар Сяргеевіч з нястрымнай энергіяй займаецца пошукам цікавых акцёраў, чарговых рэжысёраў, выхаваннем свайго гледача.

Каля паловы трупы складалі выхаванцы беларускай тэатральнай школы, астатняя частка — запрошаныя Пятроўскім акцёры з розных куткоў савецкай краіны: ад Кішынёва да Вільнюса, ад Калінінграда да Уладзівастока. У выніку нараджаецца новы творчы калектыў — працаздольны, з багатымі патэнцыйнымі магчымасцямі. На гродзенскай сцэне сустрэліся прадстаўнікі розных тэатральных школ, але Ігару Сяргеевічу ўдалося стварыць калектыў адзінай эстэтычнай сістэмы, творчы ансамбль, здольны вырашаць любыя задачы. Ён любіў сваіх акцёраў. Вось што ён сам казаў: "Самая ўдзячная, але і самая складаная праца ў тэатры ў акцёра. Ён выносіць на сцэну не словы аўтара і не нашы рэжысёрскія прыдумкі, а сваё сэрца, нервы, усю сваю істоту, ён творыць мастацкі вобраз. Асабліва я люблю акцёраў, якія прыўносяць у працу сваю сатворчасць, грамадзянскі тэмперамент. А сёння гэта асабліва важна — суаднесці сваё мастацтва з праўдай і велізарнымі задачамі, пастаўленымі перад намі".

Калектыў тэатра са сваім лідарам Ігарам Пятроўскім.

Кажуць акцёры…

Тэатр штогод паказвае свае спектаклі ў гастрольных турах па ўсім Савецкім Саюзе. Як прыгадвае заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, акцёр тэатра Мікалай Емяльянаў, Пятроўскі штогод вазіў трупу на поўдзень, і доўжылася гэта па два — тры месяцы, замаўляў вагоны, каб ездзілі цэлымі сем'ямі: "Ён быў майстрам тэатральнай справы, выдатным кіраўніком. Запрашаючы цікавых рэжысёраў і акцёраў, "выбіваў" для іх кватэры. Чалавек быў магутны, заўсёды дамагаўся свайго".

Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Людміла Волкава адзначае, што Пятроўскі быў чалавекам моцнай волі, нялёгкага характару, які дасканала ведаў тэатральную справу: "Ён вырашаў самыя складаныя справы ў жыцці тэатра і акцёраў. Тэатр натуральна віраваў! Гэта быў залаты час для калектыву, у гісторыі якога, дзякуючы Пятроўскаму, засталося шмат акцёрскіх і рэжысёрскіх перамог".

Артыстка Алена Красікава прыгадвае, што Ігар Сяргеевіч любіў акцёраў, здолеў згуртаваць вакол сябе не толькі трупу, але і ўвесь калектыў. "Працавалі ўсе дружна, адначасова на дзвюх сцэнах. Уся трупа была стала занятая. Пры Пятроўскім быў творчы ўздым і росквіт тэатра!" — кажа візаві.

Тры моры і "Тры ўзросты…"

Артыст і рэжысёр тэатра Аляксандр Глотаў таксама распавядае пра пік росквіту тэатра з бясконцымі гастролямі: "За адно лета трупа тэатра наведала тры моры — Мінскае, Балтыйскае і Чорнае. За год выпускалася больш за дзясятак спектакляў. Фінансавы план удвая перавышаў план Купалаўскага тэатра! Уражвала і тое, што Ігар Сяргеевіч запрашаў на пастаноўкі знакамітых рэжысёраў — Сіманава, Карагоцкага, Аглобліна і іншых".

Кампазіцыю па няскончаных п'есах Марыны Цвятаевай зрабіў для тэатра народны артыст СССР Яўген Сіманаў. Называецца яна "Тры ўзросты Казановы". Пасля пастаноўкі ў тэатры імя Яўгена Вахтангава рэжысёр узнавіў яе на гродзенскай сцэне. І гэта дало магчымасць запрасіць для ўдзелу ў нашым спектаклі народнага артыста СССР Васіля Ланавога.

Развіваецца ў гродзенцаў і сяброўства з Беластоцкім тэатрам імя Аляксандра Венгеркі. Прычым не толькі рэгулярна праводзяцца абменныя гастролі: так, галоўны рэжысёр гродзенскай трупы, заслужаны дзеяч мастацтваў Татарстана і Абхазіі Ігар Пятроўскі паставіў у польскім тэатры спектакль "Выбар" паводле рамана Юрыя Бондарава, які ішоў і на гродзенскай сцэне. Затым калектывы абмяняліся выканаўцамі ў спектаклях.

І візітоўка!

Своеасаблівай візітоўкай тэатра стаў спектакль "Князь Навагрудскі", створаны Ігарам Сяргеевічам у жанры гістарычнай драмы. Па сутнасці, п'еса стваралася ў сценах тэатра, а рэжысёр здолеў аб'яднаць у працы над спектаклем людзей, творча адораных. Ды такім чынам, каб унёсак кожнага стаў неад'емным ад агульнай задумы! Уменне Пятроўскага з'яднаць музыку, святло, сцэнаграфію і пантаміму ў адзінае складанае эмацыйнае дзейства не пакінула абыякавым гледача.

За гады ў Гродзенскім абласным драмтэатры не было, відаць, спраў і клопатаў, да якіх так ці інакш не меў бы дачынення нястомны Пятроўскі. Ён увесь час арганізоўваў, кіраваў, хадайнічаў, раіў, засядаў як дэпутат гарадскога савета, прэзідэнт Асацыяцыі творчых саюзаў "Хутар", член Рады камітэта абароны міру, Саюза тэатральных дзеячаў БССР. Ён Майстар, які меў вялікі вопыт і аўтарытэт, быў выдатным кіраўніком і проста чалавекам, бясконца закаханым ў Тэатр.

Леакадзія МАКСІМОВІЧ,
літаратурны рэдактар тэатра

Калі паміраюць коні —
дыхаюць,
Калі паміраюць травы —
сохнуць,
Калі паміраюць сонцы —
яны гаснуць,
Калі паміраюць людзі —
пяюць песні.
Велімір Хлебнікаў.

Ён быў адзін з самых адораных, самых своеасаблівых, жывых і разумова-спагадлівых творчых людзей, якіх можна было сустрэць у нашу эпоху. Своеасаблівасць была ўсё ж найбольш прыкметнай яго рысай. І ў кожным сваім меркаванні, у кожным слове і ў кожнай мелодыі, у кожнай ноце заставаўся самім сабою.

Барыс КРЭПАК

Аднойчы я спытаў гэтага чалавека, незадоўга да яго смерці: "Што ты адчуваеш унутры сябе як жывы класік беларускай музычнай прасторы канца XX стагоддзя?" Ён са здзіўленнем паглядзеў на мяне як на вар'ята і засмяяўся: "Ты што? Жартуеш? Які я класік? Я — проста Уладзімір Мулявін… Я — проста рабочы конік…" І тут я задаў іншае пытанне: "Што для цябе значыць званне Галоўнага Песняра? — "Скажу так. Слова "Пясняр" для мяне не толькі — і нават не столькі назва. Я не хацеў, каб яно калі-небудзь стала гандлёвай маркай. Пясняр — гэта, я шмат разоў тое казаў, вобраз жыцця, вобраз мыслення. Пясняр — гэта Янка Купала. Песняр — гэта Якуб Колас. І Максім Багдановіч. І я стараюся ва ўсім браць прыклад з такіх асоб, каб потым не было сорамна за тое, што я зрабіў у сваім жыцці і ў сваёй творчасці"…

Да свайго сённяшняга 75-гадовага юбілею ён не дажыў, але я заўсёды бачу яго рэальна жывым, прыгожым, добрым, непаўторным, зусім не падобным па чалавечай арганіцы да многіх маіх верных і таленавітых сяброў. І мне да гэтага часу не верыцца, што яго няма. А мо ён насамрэч ёсць, мой добры сябра і амаль аднагодка?..

Спакуслівая перспектыва, ды толькі мала веру я ў варажбу дзяўчыны Ленарман, у нуль-транспарціроўку, у паганскія міфы і рэлігійныя тэксты, у рэінкарнацыю, у версіі Раймонда Моўдзі і Мелвіна Морса. Хаця ў гэтым "нешта" ёсць, і калісьці, у юнацтве, хацеў у гэта верыць. Як пад моцным уражаннем ад рамана Джэка Лондана "Утаймавальная кашуля" ("Вандроўнік па зорках") хацеў верыць у магчымасць існавання не-

З драўлянага сюжэта

Асноўнымі дэкаратыўнымі элементамі аздаблення замкавых памяшканняў у свеце, у тым ліку і ў Мірскім замку, з'яўляліся прадметы мэблі, у першую чаргу сталы, крэслы, скрыні для адзення і захоўвання каштоўнасцяў.

Наогул, найстаражытныя з куфраў, што захаваліся, былі выраблены ў Старажытным Егіпце. Скрыні ўпрыгожвалі багатым своеасаблівым арнаментам, выкананым у тэхніцы паглыбленай разьбы. У аздабленні часта сустракаецца раслінны матыў, напрыклад, лаза са змешчанымі сярод завіткоў фігурамі жывёл і людзей. Паступова ў арнамент усё часцей уключалі элементы антычнай архітэктуры. Сюжэты ўскладняліся, перавага аддавалася выяве чалавека. Скрыні рабілі вялікімі (даўжынёй да 2 метраў) або маленькімі (50 — 60 сантыметраў).

У зборах музея "Замкавы комплекс "Мір" знаходзіцца куфар XVII стагоддзя са шматфігурнай сцэнай на біблейскі сюжэт "Сусана і старцы". Паводле падання, у Вавілоне жыў Іякім, які ажаніўся на Сусане, вельмі прыгожай і богабаязнай дзяўчыне. Ён быў вельмі багатым і меў каля дома сад, куды прыходзілі іудзеі. Два старцы былі пастаўлены суддзямі, каб ліквідаваць беззаконне ў Вавілоне. Яны ўвесь час праводзілі ў доме Іякіма, куды да іх і завітвалі ўсе, хто меў спрэчныя пытанні. Калі апоўдні народ сыходзіў, Сусана спускалася ў сад свайго мужа для шпацыру. За ёй назіралі старцы. Аднойчы, калі на дварэ стала горача, Сусана ў суправаджэнні дзвюх служанак захацела памыцца ў садзе. Там нікога не было, акрамя двух старцаў, што схаваліся. Сусана папрасіла служанак, каб прынеслі ёй алею, мыла і замкнулі браму ў сад. Калі служанкі выйшлі, старцы прыбеглі да Сусаны і пачалі ўпрошваць яе пабыць з імі. Сусана ім адмовіла, закрычаўшы моцным голасам. На што мужчыны таксама закрычалі. Адзін з іх пабег і адчыніў сад. Тыя, хто знаходзіўся ў доме, збегліся на крык. Старцы распавялі спалоханым, што служанкі былі адасланыя таму, што ў Сусаны быў юнак.

Фрагмент куфра XVII ст.

На наступны дзень, калі сабраўся народ да яе мужа Іякіма, прыйшлі і абодва старцы. Сусана гучна звярнулася па дапамогу да Бога, і Гасподзь пачуў яе. Калі Сусану прывялі на смерць, ён паслаў святы дух юнака Даніила для высвятлення ісціны. Той паклікаў аднаго са старцаў і спытаў, пад якім дрэвам ён бачыў юнака і Сусану. Першы адказаў, што пад масцікавым. Затым Даніил, выдаліўшы аднаго старца, папрасіў прывесці другога і задаў яму тое ж пытанне. Старац адказаў, што бачыў каханкаў пад зялёным дубам. Такім чынам атрымалася высветліць праўду. Сусана была выратавана, а Даніил стаў з таго дня вялікім прарокам. Старцы ж за сваю хлусню паплацілі жыццём.

Юлія БЯЗНОСІК,
супрацоўнік музея
"Замкавы комплекс "Мір"
Фота Вікторыі НАРБУТОВІЧ

Беларускі Арфей з чырвонай ружай

Якім ён быў, Уладзімір Мулявін: да 75-годдзя з дня нараджэння Песняра



Уладзімір Мулявін. / Фота Канстанціна ДРОБАВА

йкага іншага жыцця. І разумеючы, што прыгоды продкаў Стэндзінга ў далёкім мінулым — гэта фантазіі на гістарычныя тэмы, паэтычныя выдумкі пісьменніка, — усё роўна хацелася верыць у містычнае вучэнне пра "перасяленне душ", вельмі папулярнае ў пачатку мінулага стагоддзя. Ды і сёння не забытае. Па вялікім рахунку, гэта неразгаданая Таямніца, у нетры якой сучасная навука, рэлігія і мастацтва пакуль не могуць пранікнуць, каб канчаткова прывесці яе да аднага назоўніка.

Аднак я веру, што дух чалавека застаецца назаўсёды тут, на Зямлі, прынамсі, пакуль існуе памяць пра яго. І ў мяне, прафана, цепліцца надзея на наасферу, дзе складзіруюцца ўсе нашы разумныя ідэі і ствараецца інтэлектуальны мазаічны партрэт чалавецтва, і, магчыма, адзін фрагменцік у ім будзе выкладзены маімі блізкімі людзьмі. А так у рэальнасці застаюцца карціны, кнігі, ноты, фільмы, архітэктура, помнікі, фальклор , а таксама — удзячная памяць тых, каму пашанцавала ведаць іхніх стваральнікаў. Ды ўсё ж… Усё ж варушыцца ў душы вар'яцкая надзея: а раптам сустрэнемся? Бо адваротнага яшчэ ніхто не даказаў…

■■■

Пра ўсё гэта я думаю, зноў і зноў успамінаючы Уладзіміра Георгіевіча Мулявіна, Валодзю, Мулю, з якім мяне звёў лёс у апошняе дзесяцігоддзе яго неспакойнага жыцця. Да свайго сённяшняга 75-гадовага юбілею ён не дажыў, але я заўсёды бачу яго рэальна жывым, прыгожым, добрым, непаўторным, зусім не падобным па чалавечай арганіцы да многіх маіх верных і таленавітых сяброў. Здаецца, за час нашых шматлікіх сустрэч у дамашніх інтэр'ерах, на прыродзе і ў канцэртных залах я спазнаў Уладзіміра — Асобу — як мае быць: і яго чалавечую ды творчую моц, і яго слабасці па нейкіх параметрах чалавечага быцця, і шмат што іншае.

Але ўсё роўна — штосьці і зараз не дае мне спакою. Здаецца, што далёка не ўсё яшчэ сказана пра гэтага чалавека, нягледзячы на фундаментальныя кнігі пра жыццё і мастацтва Песняра і Чалавека — "Владимир Мулявин. Нота судьбы" (2004) і толькі што выдадзеную — "Владимир Мулявин. "Сэрцам і думамі…". Да таго ж некаторыя былыя паплечнікі, калегі і тыя, хто проста быў з Валодзем калісьці побач, па розных прычынах так і не паспелі ці не змаглі "агучыць" свае адносіны да Уладзіміра Георгіевіча. Некаторыя "песняры", якія працавалі з Мулявіным, на жаль, ужо адышлі з жыцця і не пакінулі ўспамінаў пра свайго лідара і сабрата. Але ў маім архіве захаваліся рукапісныя запісы і фрагменты дыктафонных дыялогаў і маналогаў нашых з Валодзем сустрэч, якімі я да сённяшняга дня не скарыстаўся. Яшчэ свежыя і мае ўспаміны, якія з гадамі зусім, што вельмі дзіўна, не ператвараюцца ў нейкія міражы. Усё — быццам бы адбывалася ўчора… Канешне, я мог іх выкарыстаць раней, у іншых сваіх мемуарах, аднак, як кажуць, усяму свой час… У юбілейны год Уладзіміра Мулявіна мне захацелася зноў распавесці пра гэтую Асобу, пра таго, каго я ведаў, магчыма, больш з чалавечага боку, чым з прафесійнага, статуснага. Пра "бацьку" сусветнавядомага вакальна-інструментальнага ансамбля, музыканта, гітарыста, спевака, артыста, кіраўніка-арганізатара ўнікальнага праекта пад назвай "Песняры" напісана і сказана шмат — тут мне дадаць няма чаго. А вось тое, якім ён быў асабіста для мяне як сябра, таварыша, гэта ўжо часткова і "мая тэрыторыя"…

■ У гэтых успамінах я вырашыў яшчэ раз вярнуцца ў тое незваротнае мінулае, калі **Валодзя, непакорлівы і свабодалюбівы, па-дзіцячаму чысты, даверлівы і па-даросламу грэшны,** часта падмануты, пакрыўджаны, часам замкнёны ў сабе, мудры і просты, парой жудасна, да знямогі стомлены пасля канцэртаў, але заўсёды "свежы" за рулём аўтамабіля, яшчэ не стаў "легендай", "помнікам", "бронзы многопудьем", "нацыянальным гонарам".

■■■

Аднойчы, рыхтуючыся да сур'ёзнай размовы з Мулявіным, я склаў анкету з процьмай пытанняў самай рознай накіраванасці, ажно да вельмі асабістых, надрукаваў іх на сваёй пішучай машынцы (тады камп'ютара ў мяне і блізка не было), і рушыў да Валодзі дадому, на вуліцу Леаніда Бяды, 13. Пакуль нашы жонкі, Святлана Пенкіна і Людміла Крушынская, штосьці гатавалі на кухні, мы з Валодзем селі за вялікім сталом адзін насупраць другога і пачалі працаваць. На ўсе пытанні ён адказваў па-мулявінску спакойна-разважліва і годна, толькі часам шчыра здзіўляўся майму "напору": "Ты мяне дапытваеш проста як следчы…" І ён па-добраму ўсміхаўся, пагладжваючы вусы, хаця, у прынцыпе, журналістам сваю душу наўпрост не выварочваў. Так што ягоны давер да мяне дарагога каштаваў. За гаворкай я ціхенька пацягваў віно (Валодзя тады быў "у завязцы"), якое тайна ад жонкі змог прынесці з сабой, і шарыкавай асадкай запісваў непасрэдна пад пытаннямі ў анкеце яго адказы. Скончыўшы размову, папрасіў Мулю "завізаваць" кожную старонку. Праз некалькі дзён я перагледзеў анкету, і нечакана для сябе на палях адной з яе старонак убачыў знаёмы мулявінскі почырк (як гэта я раней не заўважыў!?). Дробнымі літарамі было напісана: "як хочацца выпіць…" Калі я потым расказаў яму пра дзіўную "знаходку", мы абодва доўга смяяліся…

У гэтых успамінах я вырашыў яшчэ раз вярнуцца ў тое незваротнае мінулае, калі Валодзя, непакорлівы і свабодалюбівы, па-дзіцячаму чысты, даверлівы і па-даросламу грэшны, часта падмануты, пакрыўджаны, часам замкнёны ў сабе, мудры і просты, парой жудасна, да знямогі стомлены пасля канцэртаў, але заўсёды "свежы" за рулём аўтамабіля, яшчэ не стаў "легендай", "помнікам", "бронзы многопудьем", "нацыянальным гонарам". Вярнуцца ў тое мінулае, калі ён належыў толькі свайму дому, на адным з тарцоў якога сёння вісіць мемарыяльная дошка, у тое мінулае, калі ён увесь вольны, але зусім кароткі час аддаваў самому сабе, сваім думкам, сваёй музыцы, сваім родным і блізкім. Тады ледзь развіднеецца, як ён ужо ўскокваў з пасцелі, засоўваў ногі ва ўтульныя сялянскія валёнкі, падараваныя яму Святланай і, спяшаючыся зрабіць глыток кавы, сядаў за фартэпіяна. Адкрыўшы нотны сшытак, пачынаў пісаць, пісаць, пісаць… А потым усё камячыць і выкідваць у сметніцу, нервова зацягвацца цыгарэтай ці распальваць люльку. І зноў, перабіраючы чорна-белыя клавішы, прымаўся за ноты. І так заўсёды, калі быў дома: не на гастролях, не на рэпетыцыях, не на канцэртах, не на прэс-канферэнцыях, не на прыёмах у начальства, — а менавіта дома, у той самай кватэры ў шматпавярховым доме № 13…

■■■

Але Лёс так распарадзіўся, што на досвітку 26 студзеня 2003 года пасля яго прозвішча з'явіліся даты, раздзеленыя кароткай рысай. І чалавек перастаў належыць самому сабе. Усё, што ён здзейсніў у жыцці, у творчасці, у чалавечых узаемаадносінах адкрылася наноў, з вычарпальнай глыбінёй, узвышана і чыста.

Такім чынам, дзве даты: 12 студзеня 1941 — 26 студзеня 2003. Здаецца, даўно няма з намі Уладзіміра Георгіевіча. Цэлых 13 гадоў! Урэшце, не. Ён, Чалавек і Галоўны Песняр, і сёння з намі, са мной: у тых жа ўспамінах, у музыцы, у дысках і пласцінках, у магнітафонных запісах, тэлефільмах, спектаклях, інтэрв'ю, у кнігах і фатаграфіях. У тым, што зрабіў Мулявін, так многа і душы, і сэрца, і болю, і надзеі, што хопіць з лішкам і нам, і дзецям, і ўнукам нашым. Яго творчае пасланне людзям адбылося, бо яму было дадзена, даверана, завешчана ўвасобіць у сваім мастацтве геніяльнасць двух народаў — рускага і беларускага — і, што немалаважна, супярэчлівы подых нашага вельмі складанага Часу.

На маёй асабістай палітры памяці засталіся мулявінская апантанасць стваральнасцю, рэдкая добразычлівасць у дачыненні да шчырых людзей, пранізлівая любоў да прыроды, удумлівае прачытанне паэзіі, разумнай прозы, любоў да спорту, хуткай язды на аўтамабілі, словам, захопленасць, зачараванасць жыццём ва ўсіх яго праявах. Высакароднасць, мудрасць, годнасць. І — адзінота выдатнага таленту…

Фінал жыцця аказаўся безвыходна-трагічным. Смерць у 62 гады. І застаўся толькі журботны ўздых, як у Ігара Севяраніна: "Как хороши, как свежи будут розы…" Квітнеючыя і духмяныя чырвоныя ружы, якія так любіў Мулявін. Але ружы ўжо без Песняра…

■■■

Па вялікаму рахунку, мы не былі з Валодзем блізкімі сябрамі "не разлей вада" ў звыклым сэнсе гэтага паняцця, бо такіх у яго проста не было. Гэта потым, пасля смерці нашага Арфея, яны раптам выплылі на паверхню: урэшце, так было заўсёды і ўсюды пасля сыходу выдатных, "знакавых" фігур. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. Згадаем, колькі "друзей-прыятелей" — мемуарыстаў, сярод якіх былі і выпадковыя знаёмыя, і тыя, што "раскаяліся", пранікліі розумам — учорашнія прыгнятальнікі талентаў, з'явіліся хуценька ў Ясеніна, Маякоўскага, Ахматавай, Пастэрнака, Высоцкага, Таркоўскага, Шастаковіча…

Нашы гады з Валодзем — гэта нашы сустрэчы сем'ямі: "чацвёрка плюс адзін", гэта значыць я, мая Людміла, Уладзімір, яго жонка і аднадумца Святлана і іх наследнік Валерка. Як кажуць, "сябравалі дамамі", адпачывалі на нашых "фазэндах", часцей — у мулявінскіх Лапаравічах. Там жа, у двух кроках ад дома, купаліся ў Мінскім моры, адзначалі дні нараджэння "на пленэры" або на ўтульнай верандзе, ганялі гарбату і каву, глядзелі "відзік", у добрым настроі захапляліся картачнымі гульнямі ў "дурня" і "кінга", часам хадзілі ў саўну да нашага агульнага сябра-прадпрымальніка, які шмат зрабіў карыснага і добрага для дзеячаў беларускай культуры і мастацтва. Восенню на дачу ў Лапаравічы прыязджалі сваякі, сябры і проста знаёмыя. Прыязджалі з мяхамі і сумкамі, каб сабраць сабе багаты ўраджай антонаўскіх яблык: мулявінская сям'я гэтай карыснай справай не займалася і не даглядала за сваёй велізарнай садова-гароднай дзялянкай, якая дасталася ім ад былога гаспадара "маёнтка". Таму ўся "плантацыя" пад старымі, але добра пладаноснымі яблынямі была падобная на джунглі густых пустазелляў — пырніка, крапівы, лопуху. А каб сабраць нават яблыкі, што ўпалі, не разадраўшы рукі і твар, неабходны былі і спрыт, і адпаведная экіпіроўка. І лесвіца, канешне. Працэс загатоўкі ўраджаю ішоў заўсёды весела. І усе, у тым ліку мая дачка Магда з мужам, старэйшая дачка Мулявіна Марына таксама з мужам і іншыя "яблычнікі", былі вельмі задаволеныя. Як і самі наглядальнікі-гаспадары "фазэнды".

На ўсёй тэрыторыі маёнтка дагледжана была толькі адна пляцоўка, побач з домам. Тут, закрытыя ад вуліцы штыкетнікам з варотамі, па чарзе "адпачывалі" ці чакалі рамонту мулявінскія аўтамабілі — "Волга", "Мерседэс-Бэнц 420" з дзяржнумарам 0154 РН (той самы, апошні ў жыцці Мулявіна) і песняроўскі мінівэн "Шэўрале"...

К

Працяг чытайце **ў наступных нумарах.**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі адкрылася выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя".**

Выставы:

■ Выстава твораў Мікалая Залознага **"Колер жыцця"** да 90-годдзя з дня нараджэння мастака — да 11 студзеня.
■ Выстава твораў Васіля Зянько **"Архіварыус"** — да 11 студзеня.
■ Выстава жывапісу **Рамана Заслонава** — да 25 студзеня.
■ Выстава жывапісу **Мацвея Басава** — да 11 студзеня.
■ Выстава **"Рэпліка. Керамапластыка Валерыя Калтыгіна"** — да 18 студзеня.
■ Выстава **"Гоя... Пікаса"** (графіка са збору Караленўскай акадэміі прыгожых мастацтваў (Мадрыд, Іспанія)).
■ Выстава **"Джэнтльменскі набор"** — да 25 студзеня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

Акцыі:

■ Праграма **"Калядкі ў Ваньковічаў"** — 10 і 17 студзеня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Івянецкая школа керамікі: традыцыі і сучаснасць"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ **"Музей ёлачных цацак"** — да 17 студзеня.
■ Выстава аўтарскай лялькі **"Спадарыня Лялька. Залюстэрачка"** — да 10 студзеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".

Выстава:

■ Выстава твораў омскага майстра мікрамініяцюры Анатоля Каненкі **"Цуд пад мікраскопам"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".

Выстава:

■ **"Джунглі за шклом"** — да 6 сакавіка.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.

■ Выстава **"Мумії свету"** — да 17 студзеня.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 17 студзеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

Выстава:

■ Выстава твораў — удзельнікаў конкурсу **"Калядныя замалёўкі".**

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстава:

■ **"Аўтамабіль на далоні"** — з 14 да 28 студзеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

Выстава:

■ Выстава каляднай і навагодняй паштоўкі **"Папяровы цуд на Каляды"**, падрыхтаваная сумесна з Беларускім саюзам дызайнераў, — да 10 студзеня.
■ Міжнародная выстава фота **"Гульня ў класіку"** — з 13 да 31 студзеня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
ср. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Акцыі:

■ Святочная праграма **"Запрашаюць "Святкі" на Калядкі"** — 9 і 10 студзеня з 11-й да 17-й.
■ **"Навагодняя партызанская пошта"** — да 14 студзеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Вялікі баль у палацы Радзівілаў"** — да 31 студзеня.
■ Выстава **"Спяшаюся павіншаваць Вас..."** — да 8 лютага.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Чорна-белыя вандроўкі Барыса Бокшы"** — да 15 студзеня.
■ Выстава **"Літва і Беларусь на старонках сямейнага альбома княжны Марыі Гагенлоэ"** — да 17 студзеня.
■ Выстава ўзнагарод алімпійскага чэмпіёна Максіма Мірнага **"Мірныя трафеі"** — да 15 студзеня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выставы:

■ Выстава твораў Аляксандра Каршакевіча **"Усмешкі з добраю душой"** — да 16 студзеня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**

Выстава:

■ **"Прастора Суціна"** (творчыя вынікі ўдзельнікаў аднайменнага міжнароднага жывапіснага пленэра ў вёсцы Засвір Мінскай вобласці) — да 14 студзеня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выставы:

■ Выстава **"Машыны, якія гавораць / Talking machine",** пры ўдзеле творчай групы "Рамзэс Экспа" — да 27 сакавіка.
■ Выстава жывапісу Віктара Маркаўца **"Заслаўе. Жывапісныя імпрэсіі старога горада"** — да 10 студзеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстава:

■ Выстава графікі і скульптуры Уладзіміра Даўгялы і Сяргея Аганава **"Гонар. Годнасць"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыі:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава-рэканструкцыя **"Прыцемкі Сярэднявечча. Прылады пакарання"** — да 31 студзеня.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"

г. Мінск, ул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава **"Гармонія кантрастаў"** (работы мастакоў творчага аб'яднання "Арцель" Рыгора і Наталлі Івановых) — да 10 студзеня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Інтэрактыўны выставачны праект **"У гасцях у казкі"** — да 14 лютага.
■ **"Новае ў археалогіі Гомельшчыны"** (новыя знаходкі з Мохаўскай і Гомельскай археалагічных экспедыцый пад кіраўніцтвам А.А. Макушнікава) — да 1 лютага.
■ **"Баявыя шлемы і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** (выстава прадастаўлена мастацкай майстэрняй "Стальная Спадчына" (Мінск)) — да 14 лютага.
■ **"Акварэльная сюіта Надзеі Рэпінай"** — да 24 студзеня.
■ Выстава сувеніраў і падарункаў ручной работы **"Чароўныя падарункі"** — да 24 студзеня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці",** прысвечаная чырвонай арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выставы:

■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстава да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстава **"Тры плюс ART"**.
■ Выстава **"Ад пяра гусінага да камп'ютара сучаснага"**.
■ Выстава **"Чароўны куфар"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава **"Геніны гены"** (творы Генадзя Хацкевіча, а таксама яго дзяцей Аляксея і Мадлен і ўнукаў Ганны і Пятра) — да 16 студзеня.

УВАГА! / ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

По пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне **+ 375 17 286 07 97** і па тэлефоне/факсе **+375 17 334 57 41,** альбо пішыце на электронны адрас **kultura@tut.by!**

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **9** — **"Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях) В.-А. Моцарта.
■ **10** — **"Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **10** — **"Калейдаскоп мелодый"** — канцэрт у Камернай зале імя Л.П. Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **13** — **"Вялікі навагодні баль у Вялікім тэатры"**. Пачатак у 20.30.
■ **15** — **"Дон Кіхот"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса.
■ **16** — **"Паяцы"** (опера ў 2-х дзеях) Р.Леанкавала.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **9, 10** — **"Любоў Людзей"** Д.Багаслаўскага.
■ **11** — **"Гульні ўсіх зорак"** — танцавальнае шоу.
■ **12** — **"Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
■ **13** — **"Фінт-Круазэ"** Д.Багаслаўскага, В.Красоўскага.
■ **14** — **"Кантракт"** Ф.Вэбера.
■ **15** — **"Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
■ **16** — **"Дзед"** В.Паніна.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **9** — **"Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** А.Хадоскі.
■ **10** — **"Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **14** — **"Мая жонка — ілгунння"** В.Ільіна, В.Лукашова.
■ **15** — **"Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага.
■ **16** — **"Бураціна.BY"** А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **16** — **"Лятучая мыш"** І.Штрауса.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **9, 10** — **"Таямніцы навагодняга лесу"**. Пачатак аб 11-й і а 14-й.